WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 СНЕЖНЯ 2010 г. АЎТОРАК № 249 (26857)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах павіншавалі старшыня АБСЕ і прэзідэнты Расіі, Венесуэлы, Грузіі

Кіраўніка беларускай дзяржавы з пераканаўчай перамогай на выбарах павіншаваў па тэлефоне дзеючы старшыня АБСЕ Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў.

Пазітыўна адрэагаваў на выніні выбараў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў. У тэлефоннай размове ён адзначыў, што Беларусь заўсёды будзе адной з самых блізкіх краін для Расіі, а выбары з'яўляюцца ўнутранай справай суседняй дзяржавы.

Свае віншаванні беларускаму лідару перадалі таксама Прэзідэнт Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавес і Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі.

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАЎ ІНТЭРВ'Ю EURONEWS

У час інтэрв'ю размова ішла аб праведзеных у Беларусі прэзідэнцкіх выбарах, а таксама аб узаемаадносінах Беларусі з Еўрасаюзам і Расіяй.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# БЕЛАРУСЬ ЗРАБІЛА ВЫБАР: З 79,67 % галасоў перамогу атрымаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «У Беларусі былі створаны ўсе ўмовы для сумленнай барацьбы за ўладу і сімпатыі выбаршчыкаў»

**Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў айчынных і замежных СМІ, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Адкрытасць і празрыстасць была такая, што людзі ўжо блыталіся: ці то выбары гэта, ці то гэта рэаліці-шоу «За шклом», — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Былі створаны ўсе ўмовы для таго, каб сумленна змагацца за ўладу, заваёўваць сімпатыі выбаршчыкаў».

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што ўлада забяспечыла ўсё неабходнае для таго, каб галоўная палітычная кампанія прайшла сумленна, адкрыта і ў строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам.

«Учора мы разам з мільёнамі беларускіх грамадзян трымалі экзамен перад гісторыяй, Айчынай, перад будучыняй нашых дзяцей. І мы яго вытрымалі годна! Падкрэсліваю: годна, як бы хто ні ацэньваў нашы выбары», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Па патрабаванні нашых, спадзяюся, еўрапейскіх сяброў і не толькі еўрапейскіх мы парушылі ўсялякія законы і заканадаўствы, дзейнічаючы па іх указцы. Але, як мне далажылі, аказалася і гэтага недастаткова. Напэўна, вы, паважаныя сябры, не зусім падумалі, калі нам прад'яўлялі прэтэнзіі і выстаўлялі патрабаванні. Мы ж рабілі так, як вы патрабавалі! Якія да нас прэтэнзіі?» — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што выбарчая кампанія была арганізавана пасля прыняцця новага выбарчага заканадаўства, якое было перапрацавана, каб дагадзіць АБСЕ.

«Мы імкнуліся нікому не даваць падстаў для папрокаў. Напэўна, не ўсюды ўсё прайшло гладка. Як кажуць, усе мы людзі і ніхто не застрахаваны ад памылак, — сказаў Прэзідэнт. — Але, прабачце, пісаць у заключэнні, што падлік галасоў вёўся арганізавана, але моўчкі. Слухайце, калі гэта прачытаюць у Беларусі, а мы апублікуем гэта заключэнне, 10 млн чалавек і нашы сябры будуць рагатаць! Мы што, крычаць павінны былі пры падліку галасоў ці тыя камісіі, якія лічылі?»

«Па вялікім рахунку, цяжка сказаць, чаго яшчэ мы не зрабілі, каб прэзідэнцкія выбары ў Беларусі адпавядалі нейкім сусветным стандартам? Якіх, дарэчы, пакуль фармальна не існуе, аб чым я нядаўна казаў на саміце АБСЕ ў Казахстане», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Усіх кандыдатаў зарэгістравалі, закрыўшы вочы на грахі і парушэнні. Прамы эфір прадаставілі. Дэбаты арганізавалі. Нават часу шмат было, больш за палову кандыдатаў гэтым часам не змаглі скарыстацца, таму што сказаць не было чаго. Далі магчымасць збіраць подпісы і весці агітацыю, хто дзе хацеў і як хацеў, — адзначыў Прэзідэнт. — Яны ў нас і спявалі, і танцавалі, і пераапранутымі хадзілі. І чаго толькі ні казалі! А нас папракаюць у дыктатуры — гэта пры такой свабодзе слова!»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што часта дзеянні кандыдатаў ішлі ў парушэнне Канстытуцыі. «Заклік на плошчу, а гэта было галоўным лейтматывам усіх праграм альтэрнатыўных кандыдатаў, гэта ёсць парушэнне Канстытуцыі, за што трэба было неадкладна здымаць з прэзідэнцкай гонкі. Яны гэтага хацелі, мы ім такога шанцу і задавальнення не прадаставілі», — сказаў ён.

СТАР. 2

## МЭТАЙ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАБРАБЫТ НАРОДА І СТАБІЛЬНАСЦЬ У КРАІНЕ



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка 19 снежня прыняў удзел у галасаванні ў выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на выбарчым участку нумар 1 Цэнтральнага раёна Мінска, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

На выбарчым участку прысутнічала больш за 20 назіральнікаў, у тым ліку міжнародных: з Вялікабрытаніі, Даніі, Германіі, Італіі, Расіі, Азербайджана.

У час размовы з міжнароднымі назіральнікамі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь не мае намеру любымі спосабамі дабівацца міжнароднага прызнання прэзідэнцкіх выбараў. «Мы не збіраемся ні да якога міжнароднага прызнання паўзці на карачках», — сказаў ён.

«Не трэба нам пастаянна ставіць умовы, мы самі разбяромся, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы вельмі добра адчуваем сябе ў міжнароднай супольнасці».

Што ж датычыцца апазіцыі, то, на думку Прэзідэнта, сваімі непрадуманымі дзеяннямі яна працавала на карысць дзеючай улады. «Калі шчыра казаць, то на мой бок папрацавала і апазіцыя. Вялікі, вялікі ім дзякуй за іх бесталковыя выступленні, за бесталковую агітацыю, якую яны правялі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама пацвердзіў намер развіваць партнёрскія адносіны з Захадам, але на раўнапраўнай аснове. «Калі там дзверы закрыты, значыць, мы ідзём туды, дзе яны адкрыты», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў неабходнасць пашырэння супрацоўніцтва са скандынаўскімі краінамі: «Мы самі там недапрацоўваем, абавязкова гэты вектар будзе ўзмоцнены, таму што там падобныя на Беларусь краіны».

Кіраўнік дзяржавы паглядзеў, як арганізаваны выбарчы працэс на ўчастку, пагутарыў з людзьмі, якія прыйшлі аддаць свае галасы за кандыдатаў.

Ход выбараў на ўчастку № 1 асвятлялі амаль 100 журналістаў, якія прадстаўляюць каля 40 СМІ як айчынных, так і замежных. Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні, якія іх цікавяць.

Каментуючы заявы сваіх апанентаў наконт фальсіфікацыі вынікаў цяперашніх прэзідэнцкіх выбараў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вывады можна рабіць толькі пасля завяршэння выбараў.

«Калі выбары адбудуцца, тады і можна рабіць нейкія вывады, — сказаў Прэзідэнт. — Выбары яшчэ ідуць. Будуць яны фальсіфікаваныя, не будуць фальсіфікаваныя, ёсць адпаведныя камісіі, органы, якія дадуць ацэнку гэтаму».

У той жа час Аляксандр Лукашэнка лічыць, што такія заявы апазіцыйных кандыдатаў сведчаць аб іх бяссіллі.

«Калі палітыкі, якія ідуць на выбары, а яны ледзь не за паўгода гаварылі, што будуць выбары сфальсіфікаваны, значыць, яны проста не гатовы да выбараў і адчуваюць, што, хутчэй за ўсё, яны прайграюць. Толькі вось як я магу расцаніць такія заявы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Палітык, калі ён па-сапраўднаму прыйшоў у палітыку, калі ён змагаецца за пасаду або за дэпутацкае крэсла, ён заўсёды, нават адчуваючы, што прайграе, усё роўна ўпэўнена будзе гаварыць, што выйграе, будзе перамагаць. І ні пра якія фальсіфікацыі гаворкі быць не можа». На думку кіраўніка дзяржавы, сапраўдны палітык заўсёды будзе змагацца да канца.

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што калі ідуць заявы кандыдатаў аб фальсіфікацыі, «яны даўно сябе асудзілі на адпаведную ролю».

«Сёння і мой лёс, і іншых кандыдатаў вырашыць толькі беларускі народ. Вырашыць, што трэба другі тур — будзе другі, новыя прэзідэнцкія выбары — будуць новыя», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Вы сёння адзін дзень бачыце цалкам роўнага і безабароннага Прэзідэнта».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пасля заканчэння выбараў выбарчыя урны будуць раскрыты, бюлетэні падлічаны членамі выбарчых камісій, і будзе вынесены вердыкт. «Інакш не будзе — толькі так», — сказаў ён.

Каментуючы заявы аб тым, што дзеючаму Прэзідэнту СМІ і тэлебачанне, у прыватнасці, надаюць увагі больш, чым іншым кандыдатам, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі яны будуць дзеючымі прэзідэнтамі, іх тэлебачанне будзе асвятляць столькі, колькі мяне, а, можа, і больш». Беларускі лідар адзначыў, што паколькі з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, ад яго слова ў краіне многае залежыць, а тое, што яго дзейнасць асвятляецца па тэлебачанні — гэта справаздача і празрыстасць дзеянняў. «Што людзі падумалі б, калі б хоць тыдзень не бачылі Прэзідэнта?» — задаў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца іншых кандыдатаў, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўсім ім прадастаўлена магчымасць выступіць на тэлебачанні. «Спакойна я стаўлюся да ўсялякіх заяў. Ідзе вострая палітычная барацьба. Убачыце, што яны будуць гаварыць заўтра, паслязаўтра», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

У кіраўніка дзяржавы цікавіліся, ці змогуць улады гарантаваць бяспеку людзей у выпадку, калі адбудзецца несанкцыянаваная акцыя на плошчы, да якой заклікае апазіцыя. «Усё будзе абсалютна па закону, у тым ліку і забеспячэнне бяспекі, — сказаў Прэзідэнт. — Не хвалюйцеся, нікога сёння на плошчы не будзе».

СТАР. 2



Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у вёсцы Чарапы Шклоўскага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВЫБАРЫ З РУБІКОНАМ



Фота БЕЛТА.

**ПАМЯТАЮ, як у пачатку выбарчага дня старанна занатоўвала навіны пра надзвычайнае здарэнне на ўчастку ў вёсцы Глухаўка. А пасля з гэткай жа дбайнасцю — пра гісторыю з укідам нечага ў скрыню для галасавання, калі «ўсе пачулі стук». Хто ведаў, што ўвечары ўсе звесткі пра стук і грук і нават пра пажар на ўчастку пададуцца самай дробнай драбязой...**

Проста каб вы ведалі: гэтыя радкі — здабытак шматлікіх чарнавікоў, пісаных і перапісаных дзясяткі разоў. Так цяжка тэкст не даваўся мне яшчэ ніколі. Але ж і такіх інцыдэнтаў, як учора, у маёй краіне дагэтуль яшчэ не было... Мне вельмі балюча і прыкра.

Што да вынікаў выбараў, то свой унёсак у электаральны працэс зрабілі 90,66 адсотка — крыху менш, чым на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах (тады на ўчасткі прыйшлі 92 з лішкам адсоткі). У скрыні апушчана 6,43 млн бюлетэняў.

— Перамогу атрымаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, — канстатуе **старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА**.

Інаўгурацыя павінна адбыцца не пазней за 19 лютага. Перамогу Прэзідэнту прынесла падтрымка 79,67 адсотка беларусаў, якія валодаюць выбарчым правам.

— На другім месцы — кандыдат «супраць усіх», — адзначае кіраўнік Цэнтрвыбаркама.

Яна зрабіла асаблівы акцэнт на тым, што ў свой час гэтую норму крытыкавала АБСЕ.

— Аднак мы лічым, што яе адмена прывядзе да таго, што выбаршчык будзе галасаваць нагамі.

А так сёлета 6,47% грамадзян, якія не ўпадабалі нікога, усё ж прыйшлі на ўчасткі...

Найбольшай падтрымкай, пасля пераможцы, заручыўся Андрэй Саннікаў: у яго актыве 2,44% галасоў — ухваленне 155 тыс. чалавек. З аднолькавым вынікам — у 1,97% — да фінішу прыйшлі Яраслаў Раманчук і Рыгор Кастусёў.1,77% выбаршчыкаў зрабілі росчырк у бюлетэні насупраць прозвішча Уладзіміра Някляева. Віталю Рымашэўскаму дапамаглі сваім голасам 1,1% грамадзян. У Віктара Цярэшчанку паверылі 1,08% выбаршчыкаў. На карысць Мікалая Статкевіча «выказаліся» ў сваіх бюлетэнях 1,04%. На перамогу Аляксея Міхалевіча спадзяваліся 1,02%. Менш за ўсё людзей бачыла на пасту прэзідэнта Дзмітрыя Уса — 0,48%.

СТАР. 2

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Борисовском райисполкоме,**

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства **изолированного помещения производственного корпуса, об. пл. 700,2 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Р. Ибаррури, 9 - 1.**

**Начальная цена – 493 136 000 бел. рублей.**

Задаток в сумме 40 000 000 бел. рублей перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **21.01.2011** в **15.00** по адресу: Минская обл., **г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.01.2011** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.**

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

Высший Хозяйственный Суд Республики Беларусь

Подписка

Научно-практический журнал «ВЕСТНИК ВЫСШЕГО ХОЗЯЙСТВЕННОГО СУДА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ» - это:

- Разъяснения Высшего Хозяйственного Суда, Постановления кассационной инстанции
- Тематические обзоры судебной практики по сложным категориям споров
- Статьи и комментарии судей и специалистов системы хозяйственных судов Республики Беларусь
- Электронный банк данных судебной практики *(подписчики журнала получают бесплатный доступ к электронному банку данных «Судебная практика»), подробности на www.court.by*

«СУДЕБНАЯ ПРАКТИКА» - это:

- Формирование единых подходов в применении норм материального права
- Комментарии по спорным вопросам судебной практики
- Подборки судебных постановлений по актуальным категориям дел

ПОДПИСНЫЕ ИНДЕКСЫ:

«ВЕСТНИК ВЫСШЕГО ХОЗЯЙСТВЕННОГО СУДА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»
для индивидуальных подписчиков: 74839
для предприятий и организаций: 748392
для льготной категории подписчиков: 00261

«СУДЕБНАЯ ПРАКТИКА»
для индивидуальных подписчиков: 74960
для предприятий и организаций: 749602

ISSN 1990 - 763X

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 снежня 2010 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

| Наименование предмета аукциона | Государственное имущество и право заключения договора аренды земельного участка | Капитальное строение (здание отделения почтовой связи) и право заключения договора аренды земельного участка | Здание столярного цеха и право заключения договора аренды земельного участка | Здание насосной мазутного хозяйства, здание насосной печного топлива, линия электропередач и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Столинский район, 1,2 км севернее железнодорожной станции «Припять» | Брестская область, Дрогичинский район, д. Малиновка, ул. Советская, д. 6 | Брестская область, Лунинецкий район, г. Микашевичи, ул. Маяковского, 37 | Брестская область, Столинский район, р.п. Речица, ул. Вокзальная, 14г |
| Продавец недвижимого имущества | РТУП «Белорусское речное пароходство», тел. 8 (02351) 2 29 58 | РУП почтовой связи «Белпочта», тел. 8 (0162) 20 57 80 | Республиканское унитарное производственное предприятие «Гранит», тел. (01647) 4 34 89, 4 34 51, факс (01647) 4 36 00 | Филиал Республиканского унитарного производственного предприятия хлебопекарной промышленности «Брестхлебпром» Столинский хлебозавод, тел. 8 (01655) 2 10 30, 2 37 75 |
| Сведения о предмете аукциона | Государственное имущество: артскважина с кирпичной насосной 1986 г.п, общая площадь 9,0 кв.м; трансформаторная подстанция 1986 г.п., общая площадь 36,6 кв.м, 1-эт., кирпич; очистные сооружения, площадь 46,0 кв.м; водонапорная башня 1986 г.п, объем 171 куб.м из железобетонных панелей, общая площадь 9,0 кв.м.; изолированное помещение (административно-бытовое помещение) 3-эт. кирпич., общая площадь 506,3 кв.м; изолированное помещение (котельная) 1986 г.п, кирпичное, общая площадь 49,7 кв.м; изолированное помещение (ремонтные мастерские) 1986 г.п, кирпичное, общая площадь 261,2 кв.м. Земельный участок площадью 0,5498 га, имеются ограничения в использовании земель в водоохранной зоне р. Припять и в прибрежной полосе р. Припять на площади 0,5498 га, земельный участок в установленном порядке использовать для обслуживания государственного имущества; срок аренды – 50 лет. | Здание отделения почтовой связи 1-эт. сборно-щитовое, облицованное кирпичом, общая площадь – 56,6 кв.м, в состав имущества входит холодная пристройка, сарай и уборная. Земельный участок площадью 0,1014 га; срок аренды – 50 лет. | Здание, 1-этажн., 1990 г.п., общая площадь – 99,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,0255 га, срок аренды – 49 лет, ограничения в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт на площади 0,0025 га, использовать земельный участок для размещения производства, общественного питания, торговли, услуг. | Здание насосной мазутного хозяйства, кирпичное, 1-этажн., 1988 г.п, общая площадь 26 кв.м, здание насосной печного топлива, кирпичное, 1-этажн., общая площадь 10 кв.м., 1977 г.п, линия электропередач, дата ввода в эксплуатацию 1988 г., протяженность 130,3 м, составные части: А – пункт питания ЦТП1, д1 – силовой кабель, д2 – силовой кабель. Земельный участок площадью 0,0954 га, ограничения в использовании земель на площади 0,0068 га в охранной зоне линии электропередачи, использовать для обслуживания склада ГСМ; срок аренды – 25 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 309 188 143 | 7 555 860 | 5 773 180 | 14 115 323 |
| Сумма задатка, руб. | 30 918 800 | 755 500 | 577 318 | 1 411 530 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе | | | |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел.: (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78, www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* | | | |

**Аукцион состоится 30 декабря 2010 года в 15.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.**

**Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), обязан**:

подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона установлен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Извещение с более подробной информацией об участии в аукционе ранее опубликовано в газете «Звязда» от 18.11.2010 г. № 226, от 04.11.2010 № 216.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество» в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30; прием заявлений заканчивается 30 декабря 2010 г. в 10.00.**

# «У Беларусі былі створаны ўсе ўмовы для сумленнай барацьбы за ўладу і сімпатыі выбаршчыкаў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў Прэзідэнта, на выбарах было зарэгістравана звыш 39 тысяч унутраных і больш за тысячу міжнародных наглядальнікаў. «Пусцілі ў краіну нават тых, каму ўезд да нас па аб'ектыўных прычынах быў забаронены. Прама скажу, у гэтыя дні, у гэты месяц межаў у краіне не было: хто хацеў, той і ехаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, у Беларусі было акрэдытавана каля тысячы журналістаў, дзве трэці з якіх прадстаўляюць замежныя выданні і тэлеканалы. «Захацелі нашы недзяржаўныя і, мякка кажучы, не лаяльныя да ўлады СМІ весці прамую трансляцыю з выбарчых участкаў — калі ласка, вядзіце. Паставілі відэакамеры і падглядайце сабе днём і ноччу», — сказаў Прэзідэнт.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, іншая справа, калі сапраўдная мэта некаторых яго апанентаў была ў тым, каб «стварыць карцінку ўціску, ушчамлення, зрабіць сябе ахвярай». Ён нагадаў, што напярэдадні на выбарчым участку гаварыў журналістам, што калі сапраўды ёсць намер перамагчы, то да гэтага імкнешся да апошняга і ўмееш па-мужчынску прайграваць, а не крычыш яшчэ задоўга да пачатку выбараў аб фальсіфікацыі.

«Історыя ў нашай так званай апазіцыі пачалася яшчэ на стадыі фарміравання выбарчых камісій. Маўляў, не ўключылі іх прадстаўнікоў. А каго ўключаць? Калі вывучылі прапанаваныя кандыдатуры, дык амаль праз аднаго, кожны другі — гэта асобы, якія маюць судзімасць», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць нядрэнным вынікам набраны ім на выбарах працэнт галасоў выбаршчыкаў.

«Што датычыцца лічбаў, вядома ж, пры тым, што адбывалася ў нашай краіне, пры той так званай агітацыі, гэта нядрэнны вынік. Але давайце будзем сумленныя: 20 працэнтаў або выказаліся супраць, або прагаласавалі за альтэрнатыўных кандыдатаў. Згадзіцеся, што ёсць над чым падумаць. І я буду думаць перш за ўсё аб гэтым, не забываючы пра сваіх прыхільнікаў, пра тых людзей, якія мяне падтрымалі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на пытанне аб тым, калі адбудзецца інаўгурацыя, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Я яшчэ аб гэтым не думаў і не ведаю». «Усё будзе ў рамках адпаведных працэдур і законаў», — дадаў ён.

Як паведамлялася, на выбарах Прэзідэнта Беларусі перамог Аляксандр Лукашэнка, набраўшы 79,67 працэнта галасоў. Інаўгурацыя Прэзідэнта, як раней паведамляла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына, павінна прайсці да 19 лютага 2011 года.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ўлады ведалі аб рыхтуемых з боку апазіцыі правакацыях на выбарчых участках, і абнародаваў некаторыя факты.

«Мы ведалі пра рыхтуемыя з боку апазіцыі правакацыі на выбарчых участках. Так яно і здарылася, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Былі зафіксаваны спробы подкупу членаў выбарчых камісій. Уявіце сабе, за «забеспячэнне перамогі» аднаго з кандыдатаў толькі на адным выбарчым участку горада Мінска старшыні камісіі прапаноўвалі 50 тыс. долараў!»

Паводле слоў Прэзідэнта, «неаднаразова запалохвалі і пагражалі старшыням і членам участковых камісій, большасць з якіх, дарэчы, жанчыны».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «паўсюль, дзе прысутнічалі так званыя дэмакратычныя наглядальнікі, зафіксаваны спробы з іх боку дэзарганізаваць работу выбарчых камісій». «Адпрацоўвалі выдзеленыя гранты. Бо толькі на праплату так званага альтэрнатыўнага назірання і фальшывых апытанняў на выхадзе з выбарчых участкаў некаторыя лідары апазіцыі атрымалі ад замежных фондаў сотні тысяч долараў», — сказаў ён.

«І гэта яшчэ не ўвесь букет правакацый. Дайшло да таго, што прыхільнікі асобных кандыдатаў забіралі з сабой бланкі бюлетэняў, рабілі дзясяткі копій фальшывак і спрабавалі выкарыстоўваць іх для атрымання доказаў нібыта масавай падтрымкі альтэрнатыўных кандыдатаў. Пры гэтым праведзеныя па гарачых слядах праверкі не знайшлі ніводнага доказу такіх «фактаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На думку кіраўніка дзяржавы, кіруемы характар, масавасць і разнастайнасць правакацый сведчаць аб іх зладжанай арганізацыі з боку штабоў асобных, былых цяпер ужо, кандыдатаў у прэзідэнты.

«І не аб чысціні выбарчай працэдуры яны клапаціліся, — лічыць Аляксандр Лукашэнка.



Фота БЕЛТА.

— Мэта відавочная: групам баевікоў і іх натхняльнікам патрэбна была падстава, каб у вачах міжнароднай грамадскасці і замежных сродкаў масавай інфармацыі апраўдаць загадзя запланаваны план пагромаў».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць дзеянні апазіцыі ўвечары 19 снежня ў Мінску бандытызмам, а не дэмакратыяй.

«Тое, што спрабавалі ўчыніць учора ў Мінску, — не дэмакратыя. Гэта бандытызм. Вандалы і пагромшчыкі страцілі чалавечае аблічча. Проста азвярэлі», — сказаў Прэзідэнт.

«У любой цывілізаванай краіне такія дзеянні беспакаранымі не застаюцца. На Захадзе ніхто б не стаў цырымоніцца з такімі пагромшчыкамі. Вадамёты, гумавыя кулі, слёзатачывы газ, масавыя арышты дэбашыраў — і ўсё параскідалі ўмомант», — лічыць кіраўнік дзяржавы. «І мы гэта назіралі нядаўна і назіраем у сродках масавай інфармацыі на Захадзе», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія праваахоўнікі пры гэтым стаялі цвёрда і дзейнічалі выключна ў рамках закону, абараняючы краіну і народ ад варварства і разрухі. «Праваахоўныя органы цярпліва зносілі беззаконне малойчыкаў да таго часу, пакуль у ход не пайшлі ўзрыўчаткі, пагромы і збіванні грамадзян», — сказаў Прэзідэнт.

«Я папярэджваў, у тым ліку і ў гэтай зале, публічна: рэвалюцый і крымінальшчыны ў Беларусі не будзе! Можаце называць гэта якімі хочаце тэрмінамі. Галоўнае — бяспека людзей, спакой і парадак у краіне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Лічу, пасля ўчарашніх падзей нават прыхільнікі, якія прагаласавалі за іх, хоць іх і нямнога, адвернуцца ад гэтых пагромшчыкаў і бандытаў. Не гаворачы ўжо пра рэакцыю большасці людзей на ўсю гэту вакханалію», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўчора грамадзяне краіны зрабілі свой выбар свядома, узважана, маючы на руках усе аргументы «за» і «супраць».

«У любога сумленнага і непрадузятага чалавека гэты выбар не выклікае ніякіх сумненняў. Тыя, хто помніць, якой Беларусь была ў сярэдзіне 90-х, і бачыць, якой яна стала цяпер, кажа — гэта неба і зямля, — адзначыў Прэзідэнт. — Атрымаўшы ў спадчыну бедную, даведзеную да абуха краіну, мы адрадзілі новую, суверэнную, незалежную Беларусь».

«Незалежнасць з фігавага лістка дэкларацыіператварылася ў палітычную рэальнасць. Эканоміка працуе ў інтарэсах народа і стала сапраўды нацыянальнай, а не прыдаткам замежных карпарацый. Адрадзілася вёска. Выйшлі на якасна новы ўзровень медыцына і адукацыя. Людзі не падвяргаюцца дыскрымінацыі ні па нацыянальнасці, ні па веры, ні па мове, на якой размаўляюць. Маюць стабільную работу, зарплату і ўпэўненасць у заўтрашнім дні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае, што лёс тых, хто ўчыніў беспарадкі ў Мінску 19 снежня, вырашыць суд.

«Сядзець у турме будуць толькі ў адпаведнасці з рашэннем суда і па закону. Я ў турму не саджаю. У мяне ёсць толькі адзінае права — паміласаваць чалавека», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Адзін з альтэрнатыўных кандыдатаў прайшоўся ўжо па казематах турмы, і я яго выцягнуў адтуль», — адзначыў Прэзідэнт. «Мала таго, — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка, — яго зарэгістравалі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты, нягледзячы на тое, што апошнія пяць гадоў ён у Беларусі не пражываў, а ў адпаведнасці з нашым заканадаўствам на пасаду кіраўніка дзяржавы можа балаціравацца грамадзянін Беларусі, які ў тым ліку апошнія пяць гадоў жыў на тэрыторыі краіны. Аднак мы зарэгістравалі яго, і вось вынік». «Напэўна, трэба цаніць тое, што табе пайшлі насустрач па ўсіх напрамках», — дадаў ён.

«Таму няма чаго сёння казаць пра турму. У турму ў нас ніхто нікога не заганяе, калі чалавек сам туды не імкнецца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь гатова быць партнёрам Еўропы на раўнапраўнай аснове, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што заключэнне АБСЕ, якое датычыцца праведзенай прэзідэнцкай кампаніі, цалкам не адпавядае таму, якое было на мінулых выбарах. «Яно прагрэсіўнае. Гэта крок наперад у параўнанні з тым, што было», — лічыць Прэзідэнт. На яго думку, у тым ліку на гэтым рэспубліка можа будаваць свае адносіны з Еўрасаюзам.

«Але мы не будзем нікога ўгаворваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што ўжо гаварыў аб гэтым многім еўрачыноўнікам і кіраўнікам еўрапейскіх дзяржаў як у прыватных гутарках, так і на афіцыйным узроўні. «Мы гатовы быць партнёрамі на раўнапраўнай аснове. Давайце размаўляць, давайце весці дыялог. У выніку дыялога мы на нешта выйдзем», — заявіў Прэзідэнт. Ён дадаў, што не трэба ствараць бесцяну паміж Беларуссю і ЕС. Рэспубліка гатова выбудоўваць з еўрапейцамі самыя цёплыя адносіны, калі да краіны будзе адпаведнае стаўленне і павага.

Аляксандр Лукашэнка абяцае ў бліжэйшы час абнародаваць сакрэтныя дакументы, якія датычацца дзейнасці апазіцыі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што яшчэ не паказана ўсё, што адбывалася за рамкамі выбараў. «Мы хутка надрукуем некаторыя дакументы і паглядзім, як на гэта будуць рэагаваць і тыя, хто там апублікаваны, і тыя абаронцы, якія стаяць у іх за спінай, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Усе матэрыялы будуць апублікаваны ў самай масавай газеце краіны для таго, каб беларускі народ канчаткова паглядзеў і на нашых заходніх партнёраў, і на гэту так званую апазіцыю, і на альтэрнатыўных кандыдатаў».

«Мы апублікуем усе дакументы, якія павінны захоўвацца ў архіве пад грыфам «Сакрэтна». Гэта гістарычна важная падзея», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У супрацоўніцтве Беларусі і Кітая адкрываюцца грандыёзныя перспектывы. Адказваючы на пытанне кітайскай журналісткі, Прэзідэнт адзначыў, што Кітай упэўнена прыйшоў на беларускі рынак, будуе ў Беларусі прадпрыемствы і Беларусь гэта падтрымлівае. «Кітай можа быць абсалютна ўпэўнены, што мы прадаставім яму самыя шырокія магчымасці для работы ў цэнтры Еўропы на ўвесь еўрапейскі рынак і на рынак СНД. У нас адкрываюцца грандыёзныя перспектывы ў супрацоўніцтве з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў аб тых беспрэцэдэнтных па аб'ёму пазыках, якія выдзеліў Кітай Беларусі пад канкрэтныя праекты. «Гэта дарагога каштуе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і падзякаваў кіраўніцтву і народу Кітая за падтрымку.

Кітай заняў адназначную пазіцыю, накіраваную на супрацоўніцтва з Беларуссю. Аб тым, што гэта краіна нягледзячы ні на што заўсёды будзе надзейнай апорай для беларускай дзяржавы, заявіў публічна кітайскі лідар Ху Цзіньтаа. У Цэнтральным камітэце Кампартыі Кітая было асобна разгледжана пытанне па Беларусі, і было рэкамендавана ўсім бізнэсменам, дзяржаўным служачым падтрымліваць любыя просьбы беларусаў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што вельмі даражыць добрымі адносінамі з Кітаем. «Гэта вялікая краіна, гэта другая эканоміка ў свеце. Упэўнены, што праз 10-15 гадоў вы выйдзеце на самыя перадавыя эканамічныя рубяжы, і мы будзем толькі рады», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены, што адносіны паміж Расіяй і Грузіяй з часам наладзяцца.

Аляксандру Лукашэнку задалі пытанне, як хутка магчыма аднаўленне адносін Грузіі і Расіі і ці не возьме Мінск на сябе місію пасрэдніка для прымірэння двух праваслаўных народаў. Прэзідэнт адказаў, што ён не любіць пасрэднікаў у такой справе. «Мне таксама вельмі шмат прапаноўвалі пасрэдніцтва ва ўрэгуляванні адносін з Еўрапейскім саюзам, з Амерыкай. Праўда, не бескарыслівa, але бог з імі. Я іх катэгарычна адхіляў», — сказаў ён. «Мы самі павінны прыйсці да таго, каб выбудаваць нашы адносіны і з Еўрапейскім саюзам, і з Амерыкай, што мы, дарэчы, робім і, упэўнены, паспяхова зробім», — дадаў Прэзідэнт. Ён выказаў упэўненасць, што Беларусь ужо гатова для гэтага.

Для таго каб выбудаваць адносіны паміж Грузіяй і Расіяй, трэба толькі час, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Ён далёкі ад той думкі, што ў Расіі не любяць грузінаў. «Ды не, да грузінаў вельмі добра ставяцца не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён упэўнены, што часу для аднаўлення адносін спатрэбіцца нямнога.

«І калі я ў гэтым працэсе змагу хоць крыху, хоць адну кроплю чагосьці прыўнесці, зраблю без ваганняў».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены ў добрых перспектывах супрацоўніцтва Беларусі і Польшчы. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў, адказваючы на пытанне адносна будучага міжнароднага ўзаемадзеяння дзвюх краін у рамках старшынства Польшчы ў ЕС праз шэсць месяцаў.

«Мы цяпер працуем з кіраўніцтвам Польшчы. Мы аб гэтым (супрацоўніцтве. — Заўвага БЕЛТА) гаварылі не раз, сустракаючыся з міністрам замежных спраў Радаславам Сікорскім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі высока ацаніў пазіцыю Польшчы адносна Беларусі, сказаўшы, што «ўсё, што зрабіла Польшча апошнім часам для Беларусі, дарагога каштуе». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы згадаў аб дзеяннях некаторых альтэрнатыўных кандыдатаў у прэзідэнты, накіраваных супраць супрацоўніцтва дзвюх краін. «Як бы нас ні спрабавалі асобныя альтэрнатыўныя кандыдаты ў прэзідэнты, палякі па нацыянальнасці, дарэчы, сутыкнуць ілбамі — нічога не атрымаецца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Польшча сёння зразумела, што такое Беларусь. І навошта патрэбна Беларусь Польшчы. Вось гэта галоўнае ў нашых адносінах. Усё астатняе мы выбудуем», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі. Аляксандр Лукашэнка перакананы: калі Польшча будзе праводзіць тую палітыку, якую яна праводзіла апошнія месяцы, Беларусь і Польшчу «чакае светлая будучыня». І Польшча ад гэтага супрацоўніцтва будзе мець толькі станоўчы эфект, дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прадстаўнікі СМІ пацікавіліся ў Аляксандра Лукашэнкі, як, на яго думку, падзеі вечара 19 снежня паўплываюць на падагульняючую ацэнку місіі АБСЕ.

«Часам асобныя ў місіі АБСЕ забываюць аб тым, што яны прыехалі назіраць за выбарамі. Не камандаваць, не ацэнкі даваць, калі ўжо на тое пайшло. Яшчэ раз падкрэслю прынцыповую пазіцыю беларускай дзяржавы і маю асабіста: павінны быць стандарты і крытэрыі, па якіх АБСЕ, таксама як і іншыя арганізацыі, грамадзяне, павінны ацэньваць той або іншы працэс. І тут не павінна быць ніякіх двайных стандартаў. Вось ёсць 10 крытэрыяў — па гэтых крытэрыях мы ацэньваем выбары і на Захадзе ад Вены, і на Усходзе. Гэтага няма. Таму яны прыязджаюць і, як яны гэта ўсё ўяўляюць, так і пішуць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы папрасіў «асабліва не напружвацца наконт гэтага». «Ну, прыехалі, паназіралі, ацанілі, і гэта ўжо добра. Значыць, было за чым назіраць і было што ацэньваць. Калі было б адваротнае — было б горш. Гэта іх права. Але гэта што датычыцца выбараў», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што эксперты, чыноўнікі АБСЕ — арганізацыі, куды ўваходзіць і плаціць узносы ў тым ліку Беларусь, і якія фактычна з'яўляюцца падначаленымі 56 кіраўнікоў дзяржаў, сярод якіх і беларускі Прэзідэнт, «не маюць ніякага права выходзіць, ставіць да сценкі гэтага Прэзідэнта і раздзіраць на кавалкі». «Гэта амаральна», — дадаў беларускі лідар.

На яго думку, тое, што адбылося ўвечары 19 снежня ў Мінску, не мае ніякага дачынення да выбараў, паколькі яны на той момант ужо завяршыліся. «Якія адносіны АБСЕ мае да гэтых падзей? Навошта аб гэтым сёння наогул пісаць або гаварыць? Гэта было абсалютна за рамкамі выбараў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Ну, калі ўжо вы хочаце ацаніць гэта, дык паглядзіце непрадузятым вокам на тое, што там адбылося».

«Скажыце, калі б я як дзеючы Прэзідэнт і нававыбраны ўчора ўначы не абараніў сваю краіну? Шмат жа ж не трэба — заўсёды з гэтага пачыналася. Трэба было ўзяць нейкі ўрадавы аб'ект. І зусім па-іншаму магла б пайсці і разгарнуцца сітуацыя, становішча ў краіне. Я ўжо не хлопчык, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Я ўжо гэта ўсё бачыў у свеце, і спроб было такіх у нашай краіне нямала. Я гэта ўсё разумею, да чаго гэта магло прывесці. Хто быў бы вінаваты, хто быў бы адказны за гэта? Толькі Прэзідэнт. Таму што функцыя Прэзідэнта — забяспечыць бяспеку сваіх грамадзян. І ніхто мяне сёння з нашых грамадзян, сумленных і аб'ектыўных людзей, не папракне за гэту ноч».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, адзінае, за што ён адчувае некаторую няёмкасць, — гэта за тое, што яму як кіраўніку дзяржавы і галоўнакамандуючаму давялося пасылаць хлопцаў на барыкады. «Я заўсёды сябе вельмі дрэнна адчуваю пасля таго, калі мне даводзіцца задзейнічаць ваенных людзей, — адзначыў беларускі лідар. — Я іх прасіў: не правакуйце, не ініцыюйце ніякіх боек, але калі будуць пляваць у твар — адкажыце самым жорсткім чынам».

«І вы бачылі, як дзейнічалі ваенныя: першы раз зайшлі, паспрабавалі гэты натоўп развярнуць, уціхамірыць. Здалося, што нібыта супакоіліся. Была дадзена каманда выйсці з гэтага натоўпу, прапанавана было разысціся. Не, усе гэтыя альтэрнатыўшчыкі, па якіх сёння стогне і перажывае нехта на Захадзе і на Усходзе, зноў павялі натоўп на штурм Дома ўрада», — расказаў Прэзідэнт.

«Скажыце, як павінен быў дзейнічаць Прэзідэнт і сілавыя міністры? Мы павінны былі абараніць нашу краіну і яе будучыню. Для гэтага спатрэбілася сем з паловай мінут», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы, што не раз папярэджваў прыхільнікаў акцыі аб недапушчальнасці пераходу Рубікона.

«Таму плакацца не трэба. У нас ёсць Канстытуцыя, у нас ёсць закон. Мы строга па закону спытаем з тых, хто ўчыніў гэтыя бясчынствы, хто ў іх удзельнічаў, і хто арганізоўваў, і хто яшчэ сёння на ўцёках. Мы іх абавязкова знойдзем», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Таму гэта (падзеі вечара 19 снежня. — Заўвага БЕЛТА) не мае ніякага дачынення да выбараў. Гэта было пасля выбараў. Яны (апазіцыя. — Заўвага БЕЛТА) хацелі карцінкі — яны яе атрымалі. Якія да мяне прэтэнзіі? Я зрабіў тое, што яны хацелі», — сказаў на заканчэнне Прэзідэнт.

«Мы будзем першыя ў Мытным саюзе, хто ратыфікуе ўвесь пакет дакументаў па АЭП», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка лічыць, што калі б не было Саюзнай дзяржавы, то краінам, ствараючы Мытны саюз, давялося б прайсці шлях у два разы даўжэй. «Калі б мы да Саюзнай дзяржавы змаглі далучыць Казахстан, і ён выйшаў на той узровень, што ў нас з Расіяй у Саюзнай дзяржаве, мы б даўно ўжо былі далёка наперадзе. Але так не адбылося. Мы стварылі Мытны саюз. Дзякуючы Саюзнай дзяржаве, гэтаму «праекту», мы змаглі так хутка рушыць і да АЭП, дакументы па якой сёння актыўна ратыфікуем», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Я, вядома ж, не толькі па пасадзе як старшыня Вышэйшага дзяржаўнага савета абараняю нашу Саюзную дзяржаву, але і як чалавек, які адданы дружбе з рускім чалавекам, з расіянінам, я абараняю, буду абараняць і адстойваць гэты, як яго непрыгожа называюць, «праект», — дадаў ён.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Лукашэнка ніколі не быў ворагам Расіі, як мяне спрабуюць зрабіць. Вы ведаеце, чаму мяне робяць у Расіі такім. Не верце гэтаму. Гэта маё жыццё. Гэта я ініцыяваў рэферэндум па Саюзу Беларусі і Расіі. Народ выказаўся, і прыкладна столькі ж працэнтаў, як цяпер за мяне, тады выказалася за Саюз. Гэта для мяне стратэгічная задача. Гэта я буду рабіць. Я буду трываць, калі давядзецца, я перанясу ўсе нягоды ў імя таго, каб мы далей не разыходзіліся з нашымі расіянамі. Мы — адзін народ».

**Паводле паведамленняў БЕЛТА і прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# МЭТАЙ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАБРАБЫТ НАРОДА І СТАБІЛЬНАСЦЬ У КРАІНЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка па просьбе журналістаў пракаментаваў агучаную «Вікілікс» інфармацыю пра $9 млрд, якія нібыта захоўваюцца на яго рахунках.

«Калі знойдзем $9 млрд — жанчынам крыху больш аддадзім, мужыкам — менш, — з усмешкай сказаў Прэзідэнт. — $9 млрд — гэта ўсё ж справа вартая. Знойдзеце — мне, калі ласка, 1 працэнт, 99 працэнтаў — сабе».

Журналісты папрасілі Аляксандра Лукашэнку таксама выказаць сваё меркаванне і наконт інфармацыі, якая з'явілася ў прэсе, аб тым, што на сустрэчы з кіраўніком МЗС Эстоніі ён зрабіў шэраг антырасійскіх заяў, у прыватнасці аб тым, што вайну ў Грузіі справакавала Расія.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што заўсёды вельмі асцярожны ў выказваннях з замежнымі дыпламатамі. «Што датычыцца замежных дзяржаў, асабліва заходніх, смею запэўніць, што я вельмі, вельмі акуратны і асцярожны з імі, нават калі ў нас канфідэнцыяльныя перагаворы», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што неабходна паглядзець крыніцу, цяпер жа ён апасаецца паглыбляцца, каментуючы гэта. «Такога, падкрэсліваю, ніколі не было. Усё, што я гаварыў пра Паўднёвую Асецію і Абхазію, гаварыў вельмі адкрыта і сумленна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама дадаў: «Усё, што датычыцца Расіі, я ўжо сказаў, і нават больш».

Пытанні журналістаў датычыліся і тэмы знешняй палітыкі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што пасля выбараў у Беларусі будуць цудоўныя адносіны з Расіяй і як мінімум добрыя — з ЗША. Адказваючы на пытанне, ці вернецца ў Беларусь пасол ЗША, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта залежыць ад самога пасла. «Гэта яго права: хоча вяртацца — няхай вяртаецца, не хоча — няхай знаходзіцца ў Вашынгтоне, можа, яму там больш зручна працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца адносін Беларусі з ЕС, то Аляксандр Лукашэнка заявіў, што яны будуць настолькі добрымі, наколькі гэтага жадае Еўрасаюз. «На тэму, што мы жадаем Еўрапейскаму саюзу і якімі хочам бачыць адносіны з ім, ужо сказана не аднойчы. Усё будзе залежаць ад таго, наколькі гэтага жадае ЕС. Жадаеце вы мець з намі добрыя адносіны — калі ласка, будзем гатовы з вамі супрацоўнічаць. Калі вы не пажадаеце, як і ў папярэднія гады, — мы вас прымусіць не можам».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Еўрапейскага саюза ёсць свае праблемы. «Праблем вы бачыце там больш, чым у нас. Напэўна, вы гэта заўважылі. Калі прыехалі ў Беларусь з-за мяжы, усё ўбачылі, усё ўзважылі. Там праблем не менш, — сказаў Прэзідэнт. — Калі пасля ўсяго гэтага Еўрапейскі саюз не гатовы з намі супрацоўнічаць, мы пачакаем».

Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне латвійскага журналіста, адзначыў, што Беларусь гатова больш актыўна супрацоўнічаць з Латвіяй у энергетычнай сферы. На думку кіраўніка дзяржавы, тэма энергетычнай бяспекі з'яўляецца найбольш важным пытаннем двухбаковага парадку дня. «Гэта і для вас, і для нас важна», — падкрэсліў ён.

«Калі вы пагодзіцеся з тым, што мы прапануем, то, забяспечваючы сваю энергабяспеку, дыверсіфікуючы пастаўкі энерганосьбітаў, мы ў «прычэп» прыхопім і Латвію. Для нас гэта будзе нескладана — забяспечваючы сябе, забяспечым і вас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта вашаму кіраўніцтву сказана, і ўжо даўно. Чакаем ад вас адказу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне грузінскага журналіста, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што Беларусь выбудоўвае дружалюбныя адносіны з Грузіяй. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «У нас заўсёды былі вельмі добрыя адносіны з Грузіяй. Гэта дружалюбная нам рэспубліка і народ, з якімі ў нас добрыя адносіны, і, паверце, мы не збіраемся іх псаваць».

Адно з пытанняў датычылася дыялога з прадстаўнікамі апазіцыі. Прэзідэнт адзначыў, што гатовы супрацоўнічаць з усімі, хто выступае за стабільнасць і бяспеку ў Беларусі.

«Я з бандытамі і дыверсантамі ніякіх дыялогаў не вяду, а з нармальнай апазіцыяй, — сказаў Прэзідэнт. — Павінен прызнацца, што сярод альтэрнатыўных кандыдатаў ёсць нямнога нармальных людзей, разумных, са сваёй пазіцыяй і пунктам гледжання. Я гэта ўжо ацаніў, калі вы сочыце за перадвыбарнай кампаніяй, прытым у прамым эфіры і публічна. І павінен вам сказаць, што пасля такой заявы гэты альтэрнатыўны кандыдат па рэйтынгу выйшаў на другое месца».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Я гатовы супрацоўнічаць з кім хочаце, з апазіцыяй, не апазіцыяй — з людзьмі, якія хочуць жыць у сваёй краіне і забяспечваць яе незалежнасць, каб наша краіна была спакойнай і прыгожай, як гэтага хачу я». Пры гэтым Прэзідэнт дадаў, што важна, каб замежныя госці прыязджалі ў нашу краіну, супрацоўнічалі з намі і маглі тут спакойна адпачываць, падарожнічаць.

«Мэта адна — дабрабыт народа і стабільнасць у дзяржаве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Можаце гэту «кальку» накласці на ўсе заявы альтэрнатыўных кандыдатаў і ўбачыце, з кім я буду размаўляць, а з кім — не».

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што ўпэўнена ідзе на выбары. Ён сказаў, што адчуваў вялікую падтрымку народа. «Калі б не адчуваў яе, то не стаў бы кандыдатам у Прэзідэнты», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама падкрэсліў: «У нас цудоўны народ». «Калі цяжка — еду да людзей. Менавіта ў гушчы народа наспяваюць многія складаныя рашэнні», — дадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што не збіраецца святкаваць у выпадку, калі пераможа на прэзідэнцкіх выбарах.

«Калі нехта лічыць, што выбарамі ўсё заканчваецца, то проста дрэнна разбіраецца ў палітыцы і нічога не разумее ў жыцці дзяржавы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Пасля выбараў работа ў Прэзідэнта толькі пачынаецца. Таму калі ўсё будзе добра, значыць, з заўтрашняга дня мне трэба будзе думаць аб будучым, а не святкаваць перамогу».

Адказваючы на пытанне, якім чынам правядзе сённяшні дзень, Прэзідэнт сказаў, што як звычайна. «Звычайна прыходжу дадому, як гэта было раней, на стале 15 кг дакументаў. Праўда, я пазаўчора і ўчора крыху разабраўся, адзін чамадан застаўся невялікі. Вярнуся дадому, прагляджу гэтыя дакументы, адпраўлю іх у Адміністрацыю, павячэраю. Калі будзе нармальнае надвор'е, прабягуся на лыжах, ну а потым лягу спаць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі на гэты час будзе для мяне інфармацыя, я яе атрымаю».

## ЗАЯВА ГА «БЕЛАРУСКІ САЮЗ ЖУРНАЛІСТАЎ»

**Вечарам 19 снежня частка кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія прайгралі выбары, зрабіла спробу арганізаваць масавыя беспарадкі ў цэнтры Мінска. На жаль, падчас гэтых супрацьзаконных дзеянняў пацярпелі і нашы калегі — журналісты. Некалькі чалавек былі збітыя, зламаная прафесійная апаратура.**

Акцыя на плошчы Незалежнасці з самага пачатку насіла правакацыйны характар. Яе арганізатары, якія павялі сваіх прыхільнікаў на штурм Дома ўрада, не маглі не ведаць пра наступствы. Журналісты, якія выконвалі свой прафесійны абавязак і асвятлялі гэтыя падзеі, апынуліся ў акружэнні звар'яцелага натоўпу. Так званыя лідары апазіцыі, у тым ліку кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, якія знаходзіліся на плошчы, паводле нашых звестак, не зрабілі ніякіх крокаў, каб засцерагчы ад небяспекі дзейнасць прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Падобныя паводзіны несумяшчальныя з нормамі сучаснага цывілізаванага палітычнага жыцця. Звяртаем увагу, што, паводле слоў саміх пацярпелых, супрацоўнікі праваахоўных органаў дзейнічалі строга ў рамках закона. Агрэсію праяўлялі менавіта ўдзельнікі беспарадкаў.

ГА «БСЖ» патрабуе расследавання ўсіх выпадкаў гвалту супраць журналістаў і прыцягнення вінаватых да адказнасці.

30 декабря 2010 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О сделках общества.
2. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 201.
Начало регистрации — 10.00. УНП 191303197

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже здания заготовительного ларька, 1981 года постройки. Общая площадь здания – 68,0 м.кв.**

**Здание расположено по адресу:** г. Брест, ул. Катин Бор, на земельном участке площадью 0,0387 га.

**Начальная цена** – 49 000 000 (сорок девять миллионов) рублей + НДС 20 %.

**Размер задатка для участия в аукционе** – 10 % от начальной цены.

Объект продается без условий.

Аукцион состоится **21.01.2011 г. в 12.00** по адресу: г. Брест, ул. Нефтяная, 10 (актовый зал).

Заявления на участие в аукционе принимаются до **20.01.2011 г.** включительно.

**Организатор аукциона** – Брестское районное потребительское общество.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом.

**Контактные телефоны: 8 (0162) 23 16 23; 8 (029) 722 48 06.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі Беларусі з прафесійным святам

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў кіраўніцтва, асабовы склад, ветэранаў органаў дзяржаўнай бяспекі з прафесійным святам — Днём супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі.**

«У асобе Камітэта дзяржаўнай бяспекі народ Беларусі бачыць надзейнага абаронцу яго інтарэсаў, гатовага выканаць свой абавязак у любой сітуацыі», — гаворыцца ў віншаванні.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, маючы высокі прафесійны і інтэлектуальны патэнцыял, супрацоўнікі КДБ паспяхова спраўляюцца са сваімі абавязкамі, апраўдваюць давер народа і на справе даказваюць вернасць службоваму абавязку, сапраўдны патрыятызм і павагу да закону.

Асаблівыя словы ўдзячнасці Аляксандр Лукашэнка выказаў супрацоўнікам знешняй разведкі, 90-годдзе якой адзначаецца ў гэтыя дні, а таксама ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі, чый жыццёвы шлях, мудрасць і вопыт з'яўляюцца прыкладам самаахвярнага служэння Айчыне.

Прэзідэнт пажадаў супрацоўнікам органаў дзяржбяспекі шчасця і дабрабыту, здароўя і аптымізму, поспехаў і новых дасягненняў на карысць Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ВЫБАРЫ З РУБІКОНАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такія папярэднія лічбы. Казаць пра абсалют пакуль рана: трэба яшчэ падлічыць галасы нашых суграмадзян, якія цяпер жывуць за мяжой. Праўда, іх зусім няшмат, таму сённяшнія звесткі даюць уяўленне пра вынікі выбараў на 99%. Акрамя таго, да серады ўключна ўсе незадаволеныя вынікамі выбараў могуць падаць скаргу. Пакуль іх шквалу кіраўніцтва ЦВК не назірае. Аднак такое зацішша там схільныя тлумачыць тым, што «большасць кандыдатаў і іх прыхільнікаў знаходзіцца ў пэўным шоку» пасля тых жудасных для нашай ціхай і ветлай Беларусі беспарадкаў, якія адбыліся 19 снежня.

— Перш за ўсё гэта нас вельмі напалохала, — падзялілася ўражаннямі з журналістамі старшыня Цэнтрвыбаркама.

Паводле яе слоў, ЦВК раней заўжды заставаўся недатычным для кандыдатаў... Тыя, хто ўдзельнічаў у акцыі, на яе думку, перайшлі рубікон.

— Ніхто ніколі не рабіў замах на галоўны заканадаўчы будынак краіны. Тым самым палітычныя апаненты паказалі, што гатовыя да радыкальных дзеянняў.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама расказвае, што ўсе яе калегі, якія знаходзіліся ў будынку тым вечарам «адчулі пачуццё велізарнай чалавечай трывогі», а пасля ўсяго гэтага «было адчуванне, што ўсе вярнуліся з фронту»...

Маніторынг усіх этапаў выбарчай кампаніі вяло больш за тысячу міжнародных назіральнікаў. Як ніколі шмат было на гэтых выбарах нацыянальных назіральнікаў — больш як 39 тыс. чалавек. Пры гэтым толькі тры заявы з тых, якія ёсць у распараджэнні ЦВК, паводле слоў спадарыні Ярмошынай, «можна лічыць сур'ёзнымі». У двух выпадках выбаршчыкі знайшлі ў спісах чужы подпіс насупраць свайго прозвішча: нехта атрымаў бюлетэні за іх. Гэтыя пытанні знаходзяцца на разглядзе ў пракуратуры. Быў яшчэ і зварот пра ўкід 15 бюлетэняў на адным з наваполацкіх участкаў. Аднак у тамтэйшай камісіі патлумачылі, што прорэзь занадта вузкая, каб укінуць туды 15 бюлетэняў... Ёсць таксама зварот тады яшчэ кандыдатаў (пасля закрыцця ўчасткаў 19 снежня ў 20.00 усе ўдзельнікі выбарчай кампаніі пазбавіліся такога статусу) Андрэя Саннікава і Уладзіміра Някляева наконт непрызнання ўсяго датэрміновага галасавання. Натуральна, ён будзе разглядацца пры падвядзенні канчатковых вынікаў.

— Прызнанне вынікаў выбараў місіяй АБСЕ — мая хрустальная мара, — падзялілася з журналістамі, адказваючы на іх пытанні ў інфацэнтры, старшыня айчыннага ЦВК. — А мары павінны збывацца, асабліва напярэдадні Новага года. Дзедам Марозам у гэтым выпадку будзе кіраўнік місіі.

Паслухаем жа яго самога. **Кіраўнік назіральнай місіі АБСЕ Герт АРАНС** не без шкадавання паведаміў на сустрэчы з журналістамі, што ён расчараваны тым, як праводзіўся падлік галасоў. Але першапачаткова станоўчыя змены ў беларускім заканадаўстве дазвалялі назіральнікам ад АБСЕ разлічваць на тое, што сёлетняя справаздача будзе больш пазітыўнай. Сярод адзначаных ім станоўчых момантаў таксама і тое, што ўлады аказвалі садзейнічанне рабоце місіі, а сустрэчы і перамовы з імі праходзілі ў сяброўскай атмасферы. У папярэднім заключэнні, падрыхтаваным назіральнай місіяй, канстатуецца «Прэзідэнцкія выбары прадэманстравалі, што Рэспубліка Беларусь мае яшчэ прайсці значны шлях, перш чым яна зможа цалкам адпавядаць сваім абавязацельствам у рамках АБСЕ, хоць і былі адзначаныя пэўныя змены да лепшага».

Тым часам **місія назіральнікаў ад СНД на чале з Сяргеем ЛЕБЕДЗЕВЫМ** «не знайшла фактаў, якія б ставілі пад сумненне легітымнасць выбараў». Асобныя ж выяўленыя парушэнні не маглі ўплываць на вынікі выбараў. У Беларусі былі створаныя ўсе неабходныя ўмовы для назірання за выбарамі, што сведчыць пра дэмакратычнасць і празрыстасць выбарчага працэсу, перакананыя ўдзельнікі місіі.

— Мы ацэньваем выбары як адкрытыя, адпаведныя выбарчаму заканадаўству і агульнапрызнаным дэмакратычным нормам, што дазволіла забяспечыць свабоднае волевыяўленне грамадзян, — заяўляе місія.

Дарэчы, на думку кіраўніка назіральнай місіі СНД, беспарадкі, якія адбыліся ў Мінску ў дзень выбараў, «зусім не звязаныя з выбарчым працэсам». Ён выразіў шкадаванне, што непрадуманыя заклікі некаторых кандыдатаў прывялі да такіх акцый. Проста «скарысталіся пратэстным патэнцыялам моладзі». Што да дзеянняў праваахоўнікаў, то «падчас хваляванняў у Лондане, Афінах, Парыжы яны былі больш жорсткімі, чым у Мінску», мяркуе спадар Лебедзеў. Ён перакананы, што «іх нельга разглядаць інакш як законныя».

Сваімі думкамі пра беспарадкі ля парламента падзялілася з журналістамі жанчына, якая штодня ходзіць туды на работу — **дэпутат Валянціна ЛЯВОНЕНКА**.

— Палітыка — гэта сфера рацыянальных учынкаў, а не поле для кулачных баёў, — кажа парламентарый.

Ініцыятараў інцыдэнту яна назвала абсалютна безадказнай «палітычнай шантрапой». На яе думку, «кожны ведаў дакладна, на што ідзе» і павінен несці поўную адказнасць за тое, што адбылося. А моладзь, паводле яе слоў, з'яўляецца «пад'ёмнай сілай» у любой краіне. І гэтую энергію можна скіраваць як на стварэнне, так і на разбурэнне. Падтрымка Прэзідэнта, на думку дэпутата, застаецца ранейшай, а любыя спробы дэстабілізаваць сітуацыю асуджаныя на правал.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## У БАРАНАВІЦКІМ РАЁНЕ ГРУЗАВІК ПРАТАРАНІЎ ПРЫВАТНУЮ ХАТУ

Аб гэтым **БЕЛТА** паведаміла начальнік аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Наталля Сахарчук.

Аварыя здарылася ў вёсцы Моўчадзь. 27-гадовы жыхар Мінскай вобласці падчас руху па вясковай вуліцы не справіўся з кіраваннем грузавіка на павароце і ўрэзаўся ў хату. Цяжка ўявіць, што адчула 71-гадовая жанчына, калі яе хата пахіснулася, пачала абвальвацца сцяна, а потым у печ уперлася кабіна грузавога аўтамабіля.

У выніку ДТЗ людзі, на шчасце, не пацярпелі. Драўляная хата пенсіянеркі ад удару аўтамабіля часткова абрынулася і некалькі нахілілася.

## АГОНЬ ЗА ДЗЕНЬ ЗАБРАЎ ЖЫЦЦІ 6 ЧАЛАВЕК

Раніцай загарэўся прыватны жылы дом у вёсцы Малая Грава Асіповіцкага раёна. У агні загінулі 80-гадовая гаспадыня і яе 41-гадовы сын, супрацоўнік мясцовай гаспадаркі.

Таксама ўдзень 19 снежня ў прыватным жылым доме ў Клімавічах на вуліцы Мілаславіцкай адбыўся пажар. Загінулі 52-гадовы гаспадар і 48-гадовая жанчына. Абодва не працавалі. У МНС мяркуюць, што прычынай пажару магла стаць неасцярожнасць пры курэнні.

У Быхаўскім раёне ў той жа час у жылым доме ў вёсцы Прыбярэжжа на пажары загінула 47-гадовая жанчына, якая нідзе не працавала. Верагодна, што тут прычынай стала парушэнне правіла эксплуатацыі печкі альбо нейкага цеплавога прыстасавання.

У Клічаўскім раёне ў ноч з 19 на 20 снежня ў прыватным доме ў вёсцы Нясета загінуў 73-гадовы пенсіянер, які жыў адзін. Неасцярожнае абыходжанне з агнём — папярэдняя прычына пажару.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ЯШЧЭ АДНО АКНО Ў ЕЎРОПУ

## У Брэсце ўрачыста адкрылі першы пускавы комплекс транспартна-лагістычнага цэнтра «Брэст — Белмытнясэрвіс»



**РАШЭННЕ аб стварэнні згаданага цэнтра было прынята кіраўніком дзяржавы ў лютым 2008 года. Тады ж прадпрыемству «Белмытнясэрвіс» перадалі незавершанае будаўніцтва адміністрацыйна-бытавога корпуса і складскія памяшканні транспартнага прадпрыемства «Брэстгрузаўтасэрвіс». Была пастаўлена задача стварыць транспартна-лагістычны цэнтр да 1 студзеня 2011 года, адзначыў у сваёй прамове старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр ШПІЛЕЎСКІ.**

Месца аб'екта на вуліцы Лейтэнанта Рабцава ў абласным цэнтры выбрана невыпадкова. Непадалёку праходзіць аўтатраса М1/Е30, якая з'яўляецца часткай II трансеўрапейскага транспартнага калідора «Парыж—Берлін—Варшава—Мінск—Масква». Актуальнасць ТЛЦ нашмат узрасла пасля стварэння ў 2010 годзе Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. Агульны рынак тавараў і паслуг, які стаў магчымым дзякуючы існаванню саюза, закранае так ці інакш інтарэсы 150 мільёнаў чалавек. І, вядома, усе ўдзельнікі знешнеэканамічнай дзейнасці хацелі б дастаўляць грузы своечасова, з мінімальнымі фінансавымі затратамі на перавозку, захаванне, карыстанне складамі, іншымі памяшканнямі. Усяму пералічанаму і паспрыяе новая структура.

Транспартна-лагістычны цэнтр будзе нават аказваць такія паслугі як кансалідацыя і дэкансалідацыя грузаў. Гэта значыць, спецыялісты падбяруць аднатыпныя грузы розных гаспадароў для перавозкі на адным транспартным сродку, і наадварот, раздзеляць груз аднаго перавозчыка і размяркуюць па розных транспартных адзінках, калі пунктаў прызначэння дастаўкі некалькі. І ўсё для таго, каб эканоміць сродкі і час перавозчыка. Ну і традыцыйныя паслугі (па паручыцельстве, прадстаўленні, інфармаванні мытных органаў ЕС, выдачы адзінага адміністрацыйнага дакумента, аплаце мытных збораў) будуць аказваць цяпер на больш высокім тэхнічным узроўні.

Цэнтр аснашчаны найноўшымі тэхнічнымі сродкамі, падключаны да інфармацыйных ліній, якія дазволяць у рэжыме рэальнага часу абменьвацца звесткамі з пунктам мытнага афармлення «СЭЗ-Брэст».

Варта дадаць, што на ТЛЦ створана 19 новых рабочых месцаў, спецыялісты прайшлі адпаведную падрыхтоўку. Пра гэта гаварылася падчас урачыстага адкрыцця аб'екта. Яшчэ гаспадары і госці мерапрыемства адзначалі высокі тэхнічны і тэхналагічны ўзровень лагістычных паслуг, якія пачалі аказваць на ТЛЦ. Знайшлося добрае слова і для будаўнікоў. Будаўнічы трэст № 8 Брэста правёў рэканструкцыю складоў, праклаў інжынерныя сеткі, узвёў сучасную кацельную, выканаў шэраг іншых работ у сціслыя тэрміны і якасна.

Больш за 130 патэнцыйных кліентаў з краін Еўрасаюза праявілі цікавасць да сэрвісных і мытных паслуг брэсцкага цэнтра. Гэта адзначыў у сваім інтэрв'ю пасля цырымоніі адкрыцця мытны аташэ Пасольства Бельгіі ў Расіі Поль Раас.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### На кантролі

# КОЛЬКАСЦЬ ПРАВЕРАК СКАРОЦІЦЦА

## У параўнанні з першай паловай гэтага года іх лік скароціцца больш як на 15 працэнтаў

На першае паўгоддзе наступнага года, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, запланавана 31,1 тысячы праверак, што на 5,6 тысячы менш, чым у першым паўгоддзі 2010 года. Найбольшую колькасць праверак складуць праверкі падатковых органаў, якіх на першае паўгоддзе запланавана 25,5 працэнта. Акрамя таго, праверкі органаў МНС складуць 18,2 працэнта, 17,5 працэнта — праверкі Міністэрства аховы здароўя, 6 працэнтаў — праверкі органаў МУС, 5,7 працэнта — праверкі органаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, 5,6 працэнта — праверкі органаў Мінпрыроды. А вось удзельная вага праверак органаў Камітэта дзяржкантролю ў каардынацыйных планах першага паўгоддзя наступнага года складае ўсяго толькі 1,6 працэнта. Як адзначылі ў КДК, каардынацыйны план кантрольнай дзейнасці на першае паўгоддзе 2011 года размешчаны на інтэрнэт-сайце Камітэта дзяржкантролю. Таксама ў Камітэце дзяржкантролю нагадалі, што з 1 студзеня 2010 года планавыя праверкі суб'ектаў гаспадарання назначаюцца толькі з улікам аднясення іх да трох груп рызыкі, а для нядаўна створаных суб'ектаў гаспадарання ўведзены двухгадовы мараторый на праверкі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# СЯМ'Я БЕСПРАЦОЎНЫХ ЗАГІНУЛА Ў ПОЛЫМІ

**Калі выратавальнікі прыбылі па выкліку ў вёску Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна, дом гарэў адкрытым полымем.**

Дах і столевыя перакрыцці абрынуліся ўнутр, што вельмі ўскладніла пошук людзей, якія маглі быць у пабудове. Пасля ліквідацыі агню ў рэштках дома знойдзены тры моцна абгарэўшыя целы. Мяркуецца, што загінулымі могуць быць гаспадары-сужэнцы (1961 і 1954 г.н.) і брат гаспадара (1955 г.н.) — усе беспрацоўныя.

Са слоў суседзяў, сям'я характарызавалася, у асноўным, са станоўчага боку, на ўліку не стаяла. Пры гэтым не выключаецца, што прычынай трагедыі магла стаць традыцыйная цыгарэта, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Сяргей СІДОРСКІ:

### Ва Урадзе

# «ВАЖНЕЙШЫМ КРЫТЭРЫЯМ ДЛЯ НАС ПАВІННА СТАЦЬ ІНАВАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЭКАНОМІКІ»

**НА пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло днямі пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, абмяркоўваліся праект пагадненняў па стварэнні Адзінай эканамічнай прасторы і праект пастановы аб зацвярджэнні важнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучы год.**

Што датычыцца першага пытання, то, як заўважыў віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў, тэма ўдзелу Беларусі ў такіх інтэграцыйных аб'яднаннях, як Адзіная эканамічная прасторы (АЭП), не новая. Ён нагадаў, што яшчэ ў лютым 2003 года кіраўнікі Беларусі, Казахстана, Расіі і Украіны дамовіліся аб пачатку работы па фарміраванні АЭП чатырох краін. Бакі падрыхтавалі шматбаковыя пагадненні наконт фарміравання прасторы, канцэпцыю, але затым фармат чацвёркі звузіўся да тройкі з-за асаблівай на той момант пазіцыі Украіны. У жніўні 2006 года Беларусь, Казахстан і Расія прынялі рашэнне аб паскораным стварэнні Мытнага саюза трох дзяржаў, які створаны і функцыянуе са студзеня гэтага года. І калі ва ўмовах яго функцыянавання дасягнута свабода руху тавараў, то для забеспячэння свабоднага руху капіталу, працоўнай сілы і паслуг неабходна было больш глыбокае інтэграцыйнае аб'яднанне. «Разумеючы гэта, — падкрэсліў Андрэй Кабякоў, — кіраўнікі дзяржаў 19 снежня мінулага года падпісалі план дзеянняў па фарміраванні АЭП трох краін». Яе прававая база забяспечвае стварэнне, у прыватнасці, спрыяльных умоў для інвестыцый, правядзення канкурэнтнай палітыкі, устанаўлення агульных правілаў у галіне рэгулявання дзейнасці натуральных манаполій, уніфікацыі практыкі прадстаўлення субсідый.

Спыняючыся на канкрэтных пагадненнях па Адзінай эканамічнай прасторы, намеснік прэм'ера, у прыватнасці, паведаміў, што ў пагадненні аб адзіных правілах канкурэнцыі прадугледжваецца правядзенне адзінай канкурэнтнай палітыкі, што дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускіх тавараў за кошт выраўноўвання ўмоў гаспадарання ў рамках аб'яднання. Гэтым пагадненнем уводзіцца забарона на нядобрасумленную канкурэнцыю, злоўжыванне дамінуючым становішчам гаспадарчых суб'ектаў бакоў, якія аказваюць ці могуць аказаць негатыўны ўплыў на канкурэнцыю. Пры гэтым на камісію Мытнага саюза ўскладваюцца паўнамоцтвы па кантролі за захаваннем адзіных правілаў канкурэнцыі.

Пастаянныя спрэчкі па абмежаванні падтрымкі дзяржавай беларускіх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі здымае пагадненне аб адзіных правілах дзяржпадтрымкі гэтай галіны за кошт фіксацыі дазволенага аб'ёму захадаў згаданай падтрымкі. Пагадненнем вызначаны гранічны ўзровень дзяржаўнай падтрымкі ў памеры 10 працэнтаў да валавога кошту выробленых сельскагаспадарчых тавараў, якія аказваюць скажаючы ўплыў на гандаль. Паводле слоў Андрэя Кабякова, у выніку перагаворнага працэсу і настойлівых намаганняў беларускага боку для Беларусі ўстаноўлены пераходны перыяд да 2016 года ў частцы памеру дазволеных захадаў дзяржаўнай падтрымкі сельгасвытворцаў. Так, у наступным годзе памер дазволеных захадаў дзяржпадтрымкі складзе 16 працэнтаў ад валавога кошту сельгаспрадукцыі, у 2012-м — 15 працэнтаў, у 2013-м — 14, у 2014-м — 13, у 2015-м — 12, у 2016-м — 10 працэнтаў. Сёлета ж, паводле папярэдніх падлікаў, узровень падтрымкі сельгасвытворцаў складзе 15,7 працэнта. Як лічыць віцэ-прэм'ер, плануемы аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама паэтапнае выраўноўванне закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю да ўзроўню цэн, якія дзейнічаюць у Расіі, дазволіць забяспечыць зніжэнне ўзроўню дзяржпадтрымкі беларускіх сельгасвытворцаў і пазбегнуць негатыўных наступстваў для галіны.

Згадаў Андрэй Кабякоў і пра тое, што зараз урады Беларусі і Казахстана вядуць працу па падрыхтоўцы пагаднення аб умовах пастаўкі ў рэспубліку казахстанскай нафты з улікам падпісанага паміж нашай краінай і Расіяй пагаднення аб парадку аплаты мытных пошлін пры вывазе з Беларусі за межы Мытнага саюза сырой нафты і асобных катэгорый тавараў, якія выраблены з нафты. Ён нагадаў, што пагадненнем ад 9 снежня ўстаноўленыя новыя ўмовы паставак нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь, з Расіяй былі ўрэгуляваны пытанні спагнання і пералічэння мытных пошлін пры вывазе нашай краінай за межы мытнай тэрыторыі нафты і асобных відаў нафтапрадуктаў. Таксама цяпер вядуцца перагаворы з расійскім бокам наконт цэн пастаўкі газу ў рэспубліку ў наступным годзе. Што ж датычыцца цэнаўтварэння на газ у 2012—2014 гадах, то адпаведнае пагадненне паміж «Газпрамам» і «Белтрансгазам» плануецца падрыхтаваць налета. Андрэй Кабякоў паведаміў, што ў адпаведнасці з дамоўленасцямі кіраўнікоў урадаў у 2011 годзе «Газпрам» і «Белтрансгаз» павінны падрыхтаваць пагадненне, якім будуць фарміравацца цэны на газ для Беларусі ў 2012—2014 гадах з улікам паэтапнага выхаду на роўнадаходнасць у цэнах на прыродны газ.

Увогуле, зазначыў віцэ-прэм'ер, пакет пагадненняў па фарміраванні АЭП адпавядае нацыянальным інтарэсам Беларусі і прапанаваў звярнуцца да кіраўніка краіны з просьбай прыняць рашэнне па яго ратыфікацыі.

Падчас абмеркавання пытання далейшага эканамічнага будучага рэспублікі, кіраўніком урада Сяргеем Сідорскім акцэнт быў зроблены на інавацыйным развіцці краіны. «Важнейшым крытэрыем для нас павінна стаць інавацыйнае развіццё эканомікі, — падкрэсліў ён. — Мы распрацавалі адпаведную праграму да 2015 года. Паводле гэтага дакумента, у краіне павінна быць пабудавана больш за 220 навейшых прадпрыемстваў, каля 100 трыльёнаў рублёў мы павінны ўкласці па інавацыйных праектах». Да таго ж, паводле яго слоў, адной з важнейшых задач з'яўляецца выхад на працягу трох гадоў на станоўчае сальда знешняга гандлю. Не менш важным напрамкам працы будзе і прыцягненне прамых замежных інвестыцый за кошт будаўніцтва прадпрыемстваў, стварэння новых вытворчасцяў, у тым ліку за кошт рэалізацыі ўласнасці прадпрыемстваў, якія маюць намер працаваць з замежнымі інвестарамі. Прэм'ер таксама паведаміў, што рэспубліка пераходзіць ад планавання эканомікі на ўзроўні міністэрстваў і ўстаноў да галіновага планавання. «Акрамя таго, — падкрэсліў ён, — па абласцях мы ўводзім унутраны рэгіянальны прадукт, каб бачыць, як развіваецца вобласць і колькі дадае кожная вобласць у цэлым да ВУП». У рэальным сектары эканомікі будзе надавацца ўвага якасным паказчыкам — рэнтабельнасці, прыбытку і фінансаваму аздараўленню прадпрыемства.

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў паведаміў, што налета аб'ём інвестыцый у рэальны сектар эканомікі складзе 68 трыльёнаў рублёў, з якіх на мадэрнізацыю і ўвядзенне новых працоўных месцаў запланавана 37,8 трыльёна рублёў, ці 56 працэнтаў ад агульнай сумы інвестыцый. Стратэгічна важным ён лічыць прыцягненне прамых замежных інвестыцый, якія служаць крыніцай укаранення перадавых тэхналогій у вытворчасці і кіраванні і з'яўляюцца гарантам доступу тавараў і паслуг, што выпрацоўваюцца ў нашай краіне, на знешнія рынкі. Таксама прамыя замежныя інвестыцыі дазваляюць забяспечыць стварэнне новых працоўных месцаў у рэспубліцы, прычым працоўных месцаў з высокай дабаўленай вартасцю і эфектыўнасцю. Як мяркуецца, налета ў Беларусі будзе мадэрнізавана і створана 160 працоўных месцаў, а за пяцігодку — каля 1 мільёна.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### Тэлесеткі

# Як звалі беларускага фотамастака, які пакідаў на здымках таемную манаграму «ЛД»?

**АЛЕСЬ Матафонаў працягвае паглыбляцца ў «лабірынты» гісторыі. На тэлеканале ЛАД з 18 снежня стартуе трэці сезон яго аўтарскай перадачы «Лабірынты». Сезон пачнецца цыклам перадач, прысвечаных гісторыі беларускага фотамастацтва.**



Першы фільм з цыкла «Лабірынты гісторыі беларускага фотамастацтва» прысвечаны пачатку і росквіту беларускай фатаграфіі. Аўтар праводзіць паралелі ў развіцці фатаграфічнай справы Парыжа, Масквы, Пецярбурга і Мінска. Гледачы даведаюцца пра загадкавую гісторыю першага вядомага фотаздымка ў Беларусі, які зрабіў Антон Прушынскі.

— Ідэя зрабіць цыкл фільмаў пра гісторыю беларускага фотамастацтва прыйшла не адразу, — прызнаецца «Звяздзе» **аўтар, вядучы і рэжысёр праекта Алесь МАТАФОНАЎ**. — Цягам двух гадоў я шмат падарожнічаў і рабіў здымкі — для сябе, пасля ў мяне ўзнікла ідэя высветліць, як нараджалася беларускае фотамастацтва. І калі я пачаў распрацоўваць гэтую тэму, быў прыемна здзіўлены: у Беларусі ёсць кім і чым ганарыцца. Напрыклад, працамі графа Бенядыкта Тышкевіча з сядзібы Вялае на Валожыншчыне, які быў вельмі таленавітым і цікавым фотамастаком. Але, на жаль, сёння малавядомым.

Другі фільм раскажа пра віцебскага фатографа, які вынайшаў шторна-шчылінны затвор, **Сігізмунда Юркоўскага**. Юркоўскі, вядомы як аўтар партрэтаў мастака Ільі Рэпіна, стварыў славутую калекцыю фотаздымкаў гарадскога пейзажу Віцебска канца XIX стагоддзя.

Пра сенсацыю ў сусветнай фатаграфіі — знаходку фотаальбома беларускага графа **Бенядыкта Тышкевіча** ў Парыжскай антыкварнай краме, распавядзе трэці фільм цыкла. 86 яго фотаздымкаў, большая частка якіх зроблена ў Беларусі, захоўваюцца ў Музеі фатаграфіі Нісефора Ньепса ў Францыі. Аўтар праводзіць уласнае расследаванне творчай спадчыны графа і высвятляе, што часткова яна захавалася і ў Беларусі.

Апошняя, чацвёртая, серыя фільма прысвечана гісторыі таемнай манаграмы «ЛД», якую пакідаў на сваіх фотаздымках невядомы беларускі фотамастак XX стагоддзя. Двухгадовыя пошукі дазволілі адкрыць новае імя ў гісторыі айчыннай культуры. Ім аказаўся навуковец і педагог, вынаходнік і фатограф, першы ў Беларусі выкладчык тэарэтычнай і практычнай фатаграфіі **Леў Дашкевіч**.

Серыі новага сезона «Лабірынтаў» будуць выходзіць па суботах у ранішнім эфіры тэлеканала ЛАД.

**Ілья ЛАПАТО.**

**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**

# СЛАВЯНСКАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 снежня.)*

**Падабенства моў, культур, нават ментальнасці — вось той натуральны каркас, на якім здавён-даўна грунтуецца славянскае задзіночанне. Чым выклікана і як трансфармуецца гэтая кансалідацыя сёння, абмяркоўваем з Сяргеем КАСЦЯНАМ, старшынёй Беларускага славянскага камітэта.**

— Тыя краіны ЕС, у тым ліку і славянскія, якія прывязалі сябе да долара ці да еўра, пацярпелі наймацнейшы эканамічны крах. Польшча, Чэхія і Балгарыя, якія таксама не перайшлі ні на долар, ні на еўра, менш балюча перажылі гэты крызіс. І гэта ўсё сусветнае славянства заўважыла. Яны сочаць за нашым досведам днём і ноччу. Адны таму што думаюць: Беларусь вось-вось праваліцца, іншыя — таму што падтрымліваюць, суперажываюць і кожны раз радуюцца, калі Беларусь захоўвае свае пазіцыі.

Дапамагла тут, падаецца нашаму суразмоўцу, і мудрасць беларускага народа, які «сем разоў адмерае, а рэзаць не спяшаецца». Менавіта таму, на думку спадара Касцяна, нашы грамадзяне ўсю сваю энергію скіравалі на стварэнне, а не пайшлі «на мітынгі, падпальваць машыны, наладжваць бойкі». І менавіта стваральная праца, вера ў заўтрашні дзень дапамаглі краіне выйсці з цяжкай сітуацыі, паводле меркавання старшыні Беларускага славянскага камітэта, амаль бязбольна.

— І калі ў сваім выступленні на 10-м Усеславянскім з'ездзе я сказаў, што ў гэты няпросты час, у такое спякотнае лета, мы атрымалі больш як восем мільёнаў тон збожжа... да мяне выстраіліся чэргі — запытацца, як такое ўдалося! — згадвае кіраўнік Беларускага славянскага камітэта. — Я ўсім сказаў, што ніякай таямніцы тут няма: пачынаючы з 1997 года дзяржава ўкладала ў сельскую гаспадарку велізарныя грошы. Новыя тэхналогіі, тэхніка, ва ўсіх галінах уводзіцца навуковы падыход. А што ў Балгарыі? Зямлю раздалі, тэхнікі няма, найноўшых тэхналогій таксама. Ва Украіне землі пустуюць. Расія больш як 70 адсоткаў харчавання закупляе за мяжой. Думалі, раздадуць зямлю — кожны стане фермерам... Увесь свет цяпер арыентуецца на буйную сельскую гаспадарку, якая ў нас квітнее, пераводзіцца на навуковыя рэйкі.

Дальнабачнасць беларускай улады Сяргей Касцян бачыць яшчэ і ў тым, што яна «нікому не дазволіла нічога сабе прысвоіць, раскрасці народнае дабро». Кіраўніка беларускай дзяржавы, да слова, ужо некалькі гадоў запар абіраюць ганаровым старшынёй Усеславянскага з'езда. А сёлета дэлегаты яшчэ і прынялі зварот да беларускага народа. У ім адзначаюцца дасягненні дзяржавы: *«Толькі ў вашай краіне няма непрацуючых ці разбураных заводаў і фабрык, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Толькі ваша краіна можа пастаўляць на рынак уласную, айчынную прадукцыю (ці то машынабудаванне, ці лёгкая прамысловасць). Але гэтага ўжо практычна няма ні ў Балгарыі, ні ў Польшчы, ні ў іншых паўднёва- і заходнеславянскіх краінах. Зусім мала засталося ва Украіне (пераважна Данбас і Днепрапятроўск) і штосьці ўдалося захаваць Расіі».* І выказваецца клопат пра яе далейшы лёс: *«Вы, беларусы, — народ, які мае гордасць і гонар. Аднак наша занепакоенасць выкліканая тым, што занадта шмат сотняў мільёнаў долараў вылучана на так званую «падтрымку дэмакратыі» ў Беларусі тымі, хто такім чынам давёў да жабрацкага стану нашы дзяржавы. Вялікія грошы валодаюць гэткім жа вялікім каварствам. Хочацца верыць, што вы ўстаіце і на гэты раз. Выстаіць Беларусь — значыць адродзімся і мы, астатнія славяне. Мы — дэлегаты з 11 славянскіх дзяржаў — вельмі спадзяёмся на ваш правільны выбар!».*

**Зоя ВАРАНЦОВА.**




Глыбоцкі раён, в. Удзела.

### Тваe правы

# «КАНТРАКТНЫ» ВОДПУСК МОЖА ВЯРНУЦЬ СУД

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 снежня.)*

**З «вострымі» пытаннямі па заключэнні працоўных кантрактаў мы працягваем разбірацца з дапамогай галоўнага спецыяліста юрыдычнага аддзела камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Наталлі Іванаўны ЯСІНСКАЙ.**

#### ДЛЯ «СВАЙГО РЭЖЫМУ» ТРЭБА ЗГОДА

*Любы кантракт — гэта дамова бакоў. Але ці можа работнік звярнуцца да наймальніка з прапановай замацаваць тут норму, паводле якой будзе раней пачынацца і заканчвацца працоўны дзень? Скажам, у сувязі з неабходнасцю забіраць дзіця з дзіцячага садка.*

— Увогуле час пачатку і заканчэння працы рэгулюецца правіламі ўнутранага працоўнага распарадку або графікам работ — зменнасці, — тлумачыць Наталля Ясінская. — Калі ўзнікае неабходнасць, рамкі працоўнага дня сапраўды могуць быць зрушаныя на падставе пісьмовай заявы работніка — праз загад наймальніка або праз той жа кантракт. Аднак падобнае зрушэнне магчымае толькі тады, калі змена рэжыму працы не супярэчыць інтарэсам вытворчасці і не парушае нармальную дзейнасць арганізацыі.

#### ГАРАНТЫІ ДАЕ КАЛДАГАВОР

Катэгорый, з якімі працяг кантракту з'яўляецца абавязковым, не так і шмат. Так, пры працягу або заключэнні кантракта тэрмін яго дзеяння з добрасумленнымі перадпенсійнымі работнікамі (мужчыны больш за 58 і жанчыны больш за 53 гады) вызначаецца да агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту. З працуючай жанчынай, якая знаходзіцца ў водпуску па цяжарнасці і родах, у водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — не менш чым да заканчэння гэтых водпускаў.

Апроч таго, пры ўмове згоды работніцы наймальнік абавязаны працягнуць або заключыць новы кантракт з жанчынай да таго часу, пакуль яе дзіцяці не споўніцца 5 гадоў. А кантракт з цяжарнай жанчынай з яе згоды падпісваецца на час цяжарнасці або на іншы тэрмін па пагадненні бакоў.

Фактычна «кантрактных гарантый» агульнае заканадаўства больш нікому не дае. Аднак для тых або іншых катэгорый такія гарантыі могуць быць вызначаны ў калектыўным дагаворы арганізацыі. Праігнараваць калдагавор наймальнік не мае права.

#### КАЛІ БЕСТЭРМІНОВЫ ВАРЫЯНТ?

*Аб намеры працягнуць або спыніць працоўныя адносіны наймальнік і работнік павінны пісьмова паведаміць адзін другому не менш чым за месяц да заканчэння тэрміну кантракта. Але здараецца так: кантракт закончыўся, ніхто нікому папярэджанні не рабіў, работнік паранейшаму выходзіць на сваё месца.*

— У такім выпадку лічыцца, што тэрмін дзеяння кантракта спыняецца, і работнік аўтаматычна пераходзіць на бестэрміновы працоўны дагавор, — зазначае Наталля Ясінская. — Прычым не сакрэт: многіх гэта нібыта задавальняе. Аднак тут усё ж нельга забывацца: пры пераходзе на бестэрміновы дагавор работнік пазбаўляецца «кантрактнай» прыбаўкі да зарплаты і «лішніх» дзён водпуску.

#### НІХТО НЕ ПЕРАШКОДЗІЦЬ НАГАДАЦЬ

*Жанчыны, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, — тэма для асобнай гутаркі. Калі-нікалі ў іх менавіта падчас гэтага водпуску заканчваецца тэрмін дзеяння кантракта. Аднак наймальнік пісьмовага папярэджання аб намеры працягнуць працоўныя адносіны не робіць.*

— Працоўныя адносіны — гэта адносіны двух бакоў, — заўважае Наталля Ясінская. — Таму калі наймальнік забыўся, ініцыятыву павінен праявіць работнік. Інакш кажучы, жанчына, што знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, павінна «нагадаць» пра сябе сама.

#### САМАСТОЙНА ПРАЦУ НЕ КІДАЮЦЬ

*Нарэшце, таксама няпростае пытанне — скасаванне кантракта да заканчэння яго тэрміну па жаданні работніка. Тут наймальнік можа пайсці насустрач і звольніць з фармуліроўкай «па пагадненні бакоў». Аднак калі наймальнік адпускаць работніка не хоча, то рабіць гэта ён не абавязаны.*

— Адзіным варыянтам у такой сітуацыі застаецца датэрміновае звальненне з прычыны парушэння ўмоў кантракта — прынамсі, калі работнік лічыць, што парушаюцца яго правы, — падкрэслівае Наталля Ясінская. — Але трэба дакладна памятаць: рабіць высновы аб парушэннях самастойна работнік не можа — гэта належыць да кампетэнцыі дзяржаўнай інспекцыі працы, прафсаюзаў ці суда. І рашэнне проста не выходзіць на працоўнае месца без заключэння аднаго з гэтых органаў можа закончыцца звальненнем за прагул.

**Сяргей ГРЫБ.**

Ігар БУЗОЎСКІ, першы сакратар ЦК БРСМ:

# «У БЕЛАРУСІ ЛЁГКА БЫЦЬ МАЛАДЫМ!»

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 снежня.)*

***— Як вы можаце ахарактарызаваць сённяшні актыў БРСМ.***

— Актыў БРСМ — гэта людзі, неабыякавыя да свайго лёсу, лёсу сваёй школы, ВНУ, свайго раёна, горада, вобласці і ў цэлым краіны. Гэта людзі, у прынцыпе, неабыякавыя. Людзі, якія спрабуюць змяняць штосьці навокал сябе, змяняць канструктыўна, не парушаючы жыццёвых прынцыпаў, традыцый, што існуюць сёння ў краіне, якія паважаюць гісторыю Беларусі. Гэта людзі, якія проста зацікаўлены ў тым, каб з карысцю праводзіць вольны час. Дзеля таго каб рэалізаваць свае мэты, неабходна сістэмная работа. Адзін у полі не воін. Каб чаго-небудзь дасягнуць, неабходна аб'яднацца, кансалідаваць свае намаганні. БРСМ прапануе гэтыя магчымасці. І я заўсёды гавару падчас сустрэч з моладдзю, што БРСМ сёння — гэта магчымасці. Наколькі эфектыўна маладыя людзі выкарыстоўваюць іх, гэта залежыць ад кожнага.

***— Адзін з важных напрамкаў вашай работы — студатрады. Якія тэндэнцыі намеціліся сёлета?***

— У гэтым годзе для нас адкрыліся новыя перспектывы і ў той жа час новыя праблемы. У нас ёсць праблемы з працаўладкаваннем непаўналетніх, з працаўладкаваннем на прадпрыемствах студэнтаў. Часта работадаўцы задумваюцца, ці трэба браць студэнтаў на працу, бо гэта можа пацягнуць праблемы з санэпідслужбай, МНС, узнікаюць пытанні з падаткаабкладаннем і г.д.

Сёння для работадаўцаў студатрады — пэўныя праблемы. Таму мы зараз ініцыіруем перад Міністэрствам адукацыі, упраўленнем па справах моладзі міністэрства, каб гэтыя праблемы вырашаць заканадаўча. Неабходна прымаць нарматыўную базу па рэгуляванні ўзаемаадносін паміж работадаўцамі і студэнтамі, якія спрабуюць працаўладкавацца на прадпрыемства ў рамках студатрадаўскага руху. Напрыклад, ёсць такая прапанова вызваліць атрады ад падатку ў фонд сацыяльнай абароны. Чаму сёння не падтрымаць моладзь, якая імкнецца працаваць, а не бавіць час без справы? Вядома ж, лепш, калі малады чалавек імкнецца зарабіць грошай, каб аплаціць вучобу ці нешта купіць. На самай справе гэта добрая глеба, каб падтрымаць, з аднаго боку, моладзь, а з іншага — вырашыць пэўныя сацыяльныя пытанні. Таму ініцыятыва БРСМ на будучы год закладзена ў тым, што неабходна прымаць нарматыўную базу, удасканальваць яе па падтрымцы моладзевага студатрадаўскага руху. Гэтыя прапановы зараз удакладняюцца, і ў хуткім часе, спадзяюся, яны атрымаюць ацэнку і падтрымку на ўзроўні ўрада, Адміністрацыі Прэзідэнта і кіраўніка краіны.

***— У вас апошнім часам актыўнае развіццё атрымаў валанцёрскі рух. Якія прыярытэты вы ставіце, працуючы ў гэтым напрамку?***

— У БРСМ вялікая колькасць напрамкаў для самых розных ініцыятыў моладзі, але асабіста для мяне было вельмі прыемным тое, што моладзь адрэагавала вельмі масава і пазітыўна на нашу прапанову аб арганізацыі руху «Добрае сэрца», накіраванага на падтрымку сем'яў, якім патрэбна сацыяльная дапамога, на падтрымку дзяцей-інвалідаў, ветэранаў. Гэты напрамак дзейнасці ў нас перспектыўны. Мы пра яго гучна і часта не гаворым. Мая пазіцыя ў тым, што дабрачыннасць не павінна гучаць часта. Гэта тое, што знаходзіцца ў сэрцы кожнага. І, калі гэта выкарыстоўваецца, каб падаць сябе з лепшага боку, гэта будзе няправільна. Хоць, падводзячы вынік года, я магу з упэўненасцю сцвярджаць, што моладзь сёння не тое, што не чэрствая, а, наадварот, вельмі шчырая і добрасардэчная ў адносінах да людзей, якія маюць неабходнасць у падтрымцы і дапамозе. Рух «Добрае сэрца» атрымаў падтрымку не толькі ў саюзнай моладзі, але і ў іншых юнакоў і дзяўчат. Гэта правядзенне дабрачынных марафонаў, элементарная дапамога ветэранам, якая падаецца дробяззю. Але для іх гэта глыбокая ўнутраная падтрымка, калі актывісты, напрыклад, фарбуюць плот у ветэрана ці прынясуць яму ў вёдрах вады, ці наколюць дроў, ці добраўпарадкуюць дваровую тэрыторыю. Гэта элементарныя рэчы, але яны выхоўваюць моладзь. Таму наш рух «Добрае сэрца», спадзяюся, будзе развівацца і атрымліваць усё большую падтрымку ў рэгіёнах краіны.

***— Якія арыенціры вы бачыце ў рабоце ў будучым годзе?***

— Арыенціры фарміруюцца з улікам патрэб моладзі. Гэтыя патрэбы мы вызначалі на працягу года нашымі праектамі, акцыямі. Пачынаючы з праекта «Пытанне Прэзідэнту», калі мы правялі па ўсёй краіне апытанне сярод навучэнцаў, студэнтаў і зрабілі пэўны зрэз. Гэта было не проста апытанне моладзі, не проста аналіз таго, якія праблемы існуюць у моладзевым асяроддзі для таго, каб скаардынаваць нашу дзейнасць, але гэта найперш — аналіз, наколькі мы правільна абралі праекты, неабходныя моладзі. Акрамя гэтага праекта, у нас праводзіліся сацдаследаванні сумесна з цэнтрам сацыяльных і палітычных даследаванняў БДУ. І мы робім пэўныя высновы, на падставе якіх перспектыўныя напрамкі работы заключаюцца ў дакладныя праекты. У прыватнасці, мы зразумелі, што для моладзі застаецца актуальнай другасная занятасць, валанцёрства. Для нас стаў пэўным адкрыццём сёлета рух субкультур — брэйк-данс, ціктонікі, велатрыял і многія іншыя. Мы пераканаліся ў тым, што яны ахопліваюць значную частку моладзі. Калі маладыя людзі занятыя справай, развіваюць свае навыкі, творчыя здольнасці, то мы гатовы садзейнічаць гэтаму і падтрымліваць іх рух. Таму наступны год будзе накіраваны на падтрымку моладзевых субкультур.

Усе нашы праекты заключаюцца ў такое агульнае паняцце, як патрыятызм, і выклікаюць сапраўдны інтарэс у моладзі. Напрыклад, праект — «Да абароны Айчыны гатовы». Сёлета ўпершыню мы разам з Міністэрствам абароны, МНС правялі ва ўсіх сярэдніх школах спаборніцтвы па зборы зброі на час. Самі юнакі-школьнікі, члены цэнтральнага камітэта саюза, работнікі абласных камітэтаў прымалі ўдзел у спаборніцтвах, хто хутчэй за ўсіх збярэ-разбярэ аўтамат. Здавалася б, элементарнае мерапрыемства, але яно кансалідуе людзей і акцэнтуе, што абарона Айчыны — наша агульная справа.

Можна назваць і іншыя праекты, але я хацеў бы запрасіць усіх далучацца да нашых акцый. Наша агульная справа накіравана на тое, каб Беларусь была квітнеючай, моцнай і шчаслівай. І мы чуем ад моладзі вельмі часта, што ў Беларусі лёгка быць маладым.

**Гутарыла Святлана СУХАРКО.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ**

| № лота | Наименование объекта/Краткая характеристика | Адрес объекта | Продавец | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание деревообработки (инв. № 350/С-56777).** Одноэтажное кирпичное здание, общей площадью 275,6 кв.м. Перекрытия – ж/б плиты. | г. Гомель, ул. Добрушская, 91а | ОАО «Мостоотряд № 88» | 57 050 200 | 5 705 020 |
| **Условие продажи** | Без условий. Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота. | | | | |
| 2 | **Здание окрасочного цеха** (общая площадь 926 кв.м, инв. № 350/С-96499) с открытой стоянкой, забор железобетонный, газопровод внутренний, газопровод наружный, водопровод, канализация, силовые сети, осветительные сети, тепловые сети. Площадь земельного участка 0,5033 га. | г. Гомель, ул. Федюнинского, 8 | ОАО «Автомотосервис и торговля» | 568 673 434 | 28 433 670 |
| **Условие продажи** | Без условий. Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота. Рассрочка оплаты за приобретенное имущество – до 1 года со дня заключения договора купли-продажи. | | | | |
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 27 декабря 2010 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а | | | | |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **28 декабря 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» | | | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012029970016 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по г. Минску, код 334, ОКПО 55484006, УНН 102353509 | | | | |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность. | | | | |
| **Более подробная информация о перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» за №№ 180 от 15.09.2010 г. и 203 от 16.10.2010 г.** | | | | | |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).**




## Любанскі сыраробны завод

# НА РОЗНАГА ПАКУПНІКА, НА РОЗНЫ ГУСТ

**Усяго крыху больш за год таму наведвалі мы Любанскі сыраробны завод, а колькі на ім змяненняў: з'явіліся зусім новыя вытворчасці, намнога багацейшым стаў асартымент... Пры гэтым прадпрыемства працягвае развівацца далей. Аднак пра ўсё гэта — ніжэй, а перш за ўсё — пра традыцыі любанскіх сыраробаў, наконт якіх казала галоўны тэхнолаг завода Іна Семяненя. У адказ на пытанне, ці магла б яна пазнаць любанскія сыры (вядома, у першую чаргу па іх смакавых якасцях) сярод шэрагу іншых, ці смачнейшыя яны за іншыя, яна адказала: «Адназначна».**



І ў прыватнасці гэта датычыцца галандскіх сыроў, якімі прадпрыемства займаецца ўжо 75 гадоў. А гэта, падкрэслівала галоўны тэхнолаг, — найбольш цяжкая група. Трэба з вялікай дакладнасцю вытрымаць пад слоем сыроваткі ўсе зададзеныя параметры; трэба, каб сырны пласт правільна фармаваўся, каб падчас тэхпрацэсу з сыру выйшлі лішнія газы, якія ў ім утвараюцца пад уздзеяннем розных штамаў мікраарганізмаў (а гэтых штамаў — больш за сотню); трэба, каб малюнак на разрэзе «адпавядаў», каб вочкі ў сыру правільна ўтвараліся (па гэтых вочках сыраробы звычайна мяркуюць наконт таго, ці атрымаўся сыр). «На кожным этапе столькі нюансаў. Але ёсць добрыя традыцыі, ёсць добры вопыт...» — казала галоўны тэхнолаг.

А як ацэньвае той жа галандскі сыр, увогуле любанскую сырную прадукцыю, на якой прадпрыемства пераважна спецыялізуецца, непасрэдна спажывец (удакладнім: на Любанскім сыраробным заводзе выпускаюцца таксама масла, мяккія сыры, сухое абястлушчанае малако, заменнікі натуральнага малака, іншыя прадукты малакаперапрацоўкі)? Прадпрыемства, як падкрэсліваюць тут, мае свой устойлівы рынак, свайго пакупніка — як у нашай краіне, так і за яе межамі. Дакладней, Любанскі сыраробны завод больш арыентаваны менавіта на замежны рынак і ў першую чаргу — на расійскі, хоць ён, як вядома, часам і бывае даволі капрызным. У прыватнасці, больш за 90 працэнтаў сваіх сыроў любанцы менавіта экспартуюць; любанскі завод з'яўляецца ў гэтым плане адным з вядучых прадпрыемстваў галіны як у вобласці, так і ў краіне. Прычым цяперашняя паспяховая рэалізацыя сыру датычыцца аб'ёмаў, якія ўзраслі за апошні час больш чым удвая. Так, калі яшчэ ў 2008 годзе на любанскім прадпрыемстве выраблялася штосутачна 9 тон сыру, то ў гэтым годзе штосутачны паказчык наблізіўся да 20 тон. Важкія аб'ёмы маюць любанцы, выдатна рэалізуюць сваю прадукцыю.

* * *

Як зазначана ўжо, яшчэ зусім нядаўна любанцы выраблялі ўсяго 9 тон сыру, за кошт чаго прадпрыемства так істотна рушыла наперад?

У 2009 годзе, літаральна за некалькі месяцаў, тут рэалізавалі сур'ёзны інвестыцыйны праект — увялі ў строй, у новым цэху, аўтаматызаваную лінію па вырабе галандскіх сыроў; кошт праекта склаў каля 5 мільёнаў долараў. Гэта амаль адразу ж вывела магутнасці прадпрыемства на 15 штосутачных тон. Рэалізацыя гэтага праекта стала найбольш адметным этапам у дзейнасці прадпрыемства, сюды прыйшла сучасная, прынцыпова новая тэхналогія. На новай лініі ўсе тэхналагічныя працэсы, пачынаючы ад скквашвання малака і ўтварэння сырнага зерня і заканчваючы ўкладваннем гатовых брусоў сыру на кантэйнеры, узяла на сябе аўтаматыка. Усе тэхпрацэсы стала рэгуляваць камп'ютарная тэхніка. Адпаведна, умяшанне чалавека ў іх практычна выключана, зведзена да мінімуму ўздзеянне на іх так званага чалавечага фактара. Гэта, аднак, нікольку не зменшыла ролі абслуговага персаналу, да якога новая тэхналогія прад'явіла значна больш высокія патрабаванні. Як адзначаюць цяпер на заводзе, нямногія адважыліся працаваць на новай лініі, дзе ўжо не патрабавалася нейкіх фізічных намаганняў, а пераважна трэба было «ўключаць мазгі». Зрабілі стаўку на моладзь, больш успрымальную да праяў тэхнічнага прагрэсу. З уводам аўтаматызаванай лініі на любанскім заводзе не толькі больш чым у паўтара раза нарасцілі аб'ёмы выпуску сыроў, але і значна павысілі прадукцыйнасць працы, практычна ў 2 разы скарацішы абслуговы персанал (для вызваленых людзей знайшлі іншыя працоўныя месцы), істотна зменшылі сабекошт прадукцыі, зрабілі тэхналагічны працэс вырабу сыру практычна поўнасцю закрытым, ізаляваным ад чалавека.








* * *

З рэалізацыяй адзначанага інвестыцыйнага праекта на Любанскім сыраробным заводзе, па сутнасці, запусцілі працэс няспыннай мадэрнізацыі і абнаўлення. Падчас наведвання прадпрыемства нам паказалі стары мадэрнізаваны сыраробны цэх (пачаў дзейнічаць каля 3 месяцаў таму). Шчыра сказаць, па сваім знешнім выглядзе ён практычна нікольку не адрозніваецца ад новага. «Абліцавалі ўсё новай пліткай, пераклалі дно басейнаў, паставілі чатыры новыя прэсы для прасавання расійскага сыру», — пералічвалі на заводзе зробленае.

У мадэрнізаваным старым цэху наладжаны выпуск расійскіх сыроў, разам з тым тут выпрабляюцца і сыры галандскай групы. Штосутачны агульны выпуск — 5 тон. Гэта ўжо не такія вялікія аб'ёмы, як на новай лініі; як зазначаюць на прадпрыемстве, стары мадэрнізаваны цэх больш працуе «на асартымент».

За сёлетні год на Любанскім сыраробным заводзе асвоена 40 новых відаў прадукцыі. З цвёрдых сыроў тут цяпер выпускаюць «Галандскі класічны», «Галандскі — БІА», «Букавінскі», «Пашэхонскі» (па 45 працэнтаў тлустасці), «Галандскі новы» (30 працэнтаў), «Белавежскі» гарачага і халоднага вэнджання — свайго кшталту фірменны прадукт прадпрыемства (па 29 працэнтаў), «Сливочный» (50 і 55 працэнтаў), «Мраморный» (45), «Расійскі класічны» (50), «Расійскі новы малады» (50 працэнтаў пры менш працяглым тэрміне выспявання — 20 сутак). А ў перспектыве на прадпрыемстве плануюць асвоіць новыя сыры «Рускі», «Манастырэцкі», «Анталія», «Крэмавы», «Пікантны», а таксама так званыя элітныя сыры з працяглымі тэрмінамі выспявання — «Гройцэр» і іншыя.



Апошнім часам на заводзе ўдзяляюць значную ўвагу вытворчасці сыроў з меншай тлустасцю. Такія сыры таннейшыя за больш тлустыя, і іх няблага прыняў пакупнік. Яны патрабуюць меншых тэрмінаў выспявання, што, адпаведна, паскарае абарачальнасць вытворча-тэхналагічных плошчаў. Як падкрэсліваюць на прадпрыемстве, гэта таксама пашырае той жа асартымент, дазваляе больш дакладна працаваць «на рознага пакупніка, на розны густ».

Вытворчасць плаўленых сыроў — гэта яшчэ адзін праект, рэалізаваны ў сёлетнім годзе. Імі напаўняюць 100-грамовыя поліэтыленавыя баначкі, а тры віды плаўленых сыроў выпускаюцца ў выглядзе кілаграмовых батонаў. Усяго ў асартыменце — 12 відаў, у тым ліку з такімі пікантнымі дабаўкамі, як кроп, часнок, шампіньёны і іншымі; штодзённы выпуск — каля 600—800 кілаграмаў. Тым, каму даспадобы менавіта пікантнасць, можна параіць сыркі «Вясенні», «Спатканне» (у баначках), сыр «Паляўнічы» (у батоне). Тут жа варта выдзеліць наступнае: вытворчасць плаўленых сыроў у многім была прадыктаваная тым, што пры выпуску цвёрдых сыроў часам з'яўляецца некандыцыя, або сыры з парушанымі формамі бруска, галоўкі. Гэтая, па сутнасці, дробязь вымушала адпраўляць такія сыры на перапрацоўку на іншыя заводы; з наладжваннем жа ўласнай плаўкі тут, зразумела, выйгралі эканамічна, а разам з тым, зноў-такі, пашырылі свой асартымент.

І яшчэ адзін сёлетні праект — увод вытворчасці па згушчэнні сыроваткі, якая ўтвараецца пры вырабе сыроў. Да нядаўняга часу яе амаль бясплатна аддавалі гаспадаркам; цяпер жа, ужо згушчаная, яна будзе накіроўвацца на іншыя малаказаводы для далейшай сушкі. «Гэта запатрабаваны на рынку прадукт і таксама прыносіць прыбытак, грошы», — падкрэслівалі на прадпрыемстве. А ў наступным годзе тут павінен з'явіцца спецыяльны цэх па сушцы малакапрадуктаў (цяпер тут працуе адносна невялікі сушыльны ўчастак). У выніку вытворчасць малаказавода стане практычна безадходнай.

* * *

На любанскім прадпрыемстве падкрэсліваюць: «Якасць і санітарыя, парадак побач крочаць». І пацвярджаюць гэта адпаведнымі прадпісаннямі. Так, падчас наведвання прадпрыемства нам давялося пісьмова засведчыць, што мы абсалютна не маем «пры сабе» якіх-небудзь там хваробатворных мікробаў; мы пры гэтым, тым не менш, прайшлі праз гэткі дэзынфекцыйны бар'ер (асобна для ног і для рук), прыбраліся ў спецыяльнае адзенне, прычым спецыяльны аўтамат насунуў на нашы ногі аднаразовыя «бахілы»... «Усяго гэтага і яшчэ шмат чаго іншага патрабуе сістэма ХАСП, якая дзейнічае на прадпрыемстве», — падкрэслівалі тут (нагадаем: сістэма ХАСП дзейнічае на харчовых прадпрыемствах і прадпісвае ўкараненне пэўных мер, якія забяспечваюць поўную бяспеку харчовых прадуктаў для чалавека)... Зразумела, сістэма ХАСП патрабуе і тых жа ідэальнай чысціні і парадку, якія пануюць у цэхах прадпрыемства, хоць, вядома ж, напэўна, не так важна прыняць яе прынцыпы, колькі менавіта захоўваць іх.






Усё малако, якое паступае на завод, праходзіць 100-працэнтны, прычым двайны, кантроль (хуткі экспрэс-аналіз і больш дэталёвы імунаферментны аналіз). Пры гэтым здараліся выпадкі, калі малако адпраўлялася назад у гаспадаркі, і асабліва «бязлітаснымі» былі на заводзе, калі ў малацэ выяўляліся рэшткі антыбіётыкаў, інгібіруючых рэчываў. Кантроль за якасцю сыравіны пачынаецца яшчэ на фермах, у гаспадарках, прычым менавіта з удзелам спецыялістаў прадпрыемства.

Каб зрабіць добры сыр, трэба мець не толькі добрае так званае сырапрыдатнае малако (дарэчы, для вырабу сыру на заводзе адбіраецца найлепшае малако), але і добрыя закваскі — на заводзе выкарыстоўваюць закваскі дацкіх і галандскіх вытворцаў, якія лічацца найлепшымі. Сыр, які знаходзіцца на выспяванні, перыядычна правяраецца на «правільнасць працэсу»... «Нямала клопату дастаўляе вам ваша гаспадарка», — сказалі мы Іне Яўгенаўне. «Затое мы ўпэўненыя, што наш спажывец, наш пакупнік атрымае ад нас выдатны, якасны прадукт. І будзе чакаць менавіта наш прадукт».

**Прадукцыя Любанскага сыраробнага завода, зразумела, паступае ў любанскія крамы, а таксама ў гандлёвыя кропкі іншых гарадоў і, вядома ж, Мінска — у прыватнасці, ва ўніверсамы «Талін», «Дыянісій», на Камароўскі і Ракаўскі рынкі, пры гэтым, як расказалі ў адной з гэтых кропак, асобныя пакупнікі чакаюць менавіта любанскі прадукт...**

* * *

Любанскі сыраробны завод будзе развівацца далей, пра што ўжо сказана вышэй. На заводзе таксама намечана ўжо ў хуткім часе ўстанавіць лінію па фасоўцы сыру невялікімі кавалкамі ў вакуумнай упакоўцы, лінію ўпакоўкі парцыённага нарэзанага сыру. Ужо хутка любанскае прадпрыемства павінна прапанаваць сваім спажыўцам крэм-сыры, якія павінны стаць неблагім кампанентам пры прыгатаванні бутэрбродаў.

Нямала намечана зрабіць па мадэрнізацыі і тэхнічным абнаўленні салігорскага філіяла любанскага прадпрыемства, або далучанага некалькі гадоў таму Салігорскага малакаперапрацоўчага завода. Усё гэта, зразумела, патрабуе новых інвестыцый, новых укладанняў. Але, як падкрэсліваюць у Любані, такія выдаткі — цалкам апраўданыя. Яны ў канчатковым выніку зноў-такі прынясуць дадатковы даход, дадатковыя грошы. Іншая справа — дзе ўзяць патрэбныя сродкі ў той ці іншы канкрэтны момант?

«Сыр на складзе — грошы ў кішэні», — так часам кажуць сыраробы. А, дарэчы, «у падвале» любанскага прадпрыемства, або на захоўванні ў яго складскіх памяшканнях, у камерах для выспявання (варта тут жа зазначыць: развіваючы сваю вытворчасць, на прадпрыемстве добра паклапаціліся і пра гэты немалаважны сегмент) на тэхналагічных лініях — усяго ў абарачэнні пастаянна каля тысячы тон. Неблагія грошы... Але далёка не заўсёды яны менавіта ў кішэні. На Любанскім сыраробным заводзе з непакоем гаварылі пра вялікія сумы запазычанасці яму гаспадарак раёна — каля 10 мільярдаў рублёў. Гэтыя сумы ўтварыліся ў выніку добра вядомай у краіне практыкі, калі перапрацоўчыя прадпрыемствы ў многіх выпадках авансуюць гаспадаркі сваёй зоны — на заработную плату, на абсталяванне і г.д. Варта прызнаць, што гэта не самая лепшая практыка, яна яўна схіляе тыя ж гаспадаркі да свайго кшталту ўтрыманства. Між тым, што датычыцца любанскага прадпрыемства, яно аказвае тым жа гаспадаркам немалую бязвыплатную дапамогу, — і ў першую чаргу не скупіцца на мерапрыемствы, звязаныя з якасцю сыравіны, малака. Мэта тут зразумелая: адпаведныя дывідэнды любанскія сыраробы здымаюць, калі атрымліваюць ад тых жа гаспадарак добрае, сырапрыдатнае малако. Словам, тут, можна сказаць, ёсць пэўны ўзаемны інтарэс. Але калі прадпрыемства разам з тым нясе на сабе і ўвесь цяжар іх даўгоў, гэта, мякка кажучы, — не зусім правільна. Між тым, варта тут удакладніць: любанскі сыраробны завод з'яўляецца горадаўтваральным, прычым на яго долю прыходзіцца 65 працэнтаў аб'ёмаў.

* * *

Чым цяпер заклапочаныя на Любанскім сыраробным заводзе? Як ні дзіўна — падрыхтоўкай да вясны, ці, дакладней, — падрыхтоўкай да сезона вялікага малака. Цяпер на прадпрыемстве перапрацоўваюць яго за суткі каля 250 тон, а вось у вясенне-летні сезон гатовы прымаць па 400 і больш тон. Але да гэтага трэба быць добра падрыхтаванымі... На прадпрыемстве мадэрнізуюць адну з камер выспявання сыроў, у іншых памяшканнях робяць рамонт... «Перад надыходам сезона вялікага малака ўсю вытворчасць агледзіць спецыяльная камісія, яна і выдасць адпаведнае заключэнне. Як правіла, экзамен мы заўсёды праходзім паспяхова», — зазначалі тут.

А яшчэ тут рыхтуюцца да атэстацыі вытворчасці па міжнародных стандартах ІСО 22000, якія прадугледжваюць захаванне пэўных правіл і патрабаванняў, што абавязковыя як пры вырабе гатовай прадукцыі, так і пры атрыманні зыходнай сыравіны — малака, або па ўсім так званым харчовым ланцужку, і зноў-такі датычацца бяспекі гатовай прадукцыі для спажыўца.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

УНП 600017217.



**Сыр з'яўляецца найбольш выгадным прадуктам малакаперапрацоўкі. У Беларусі цяпер выкарыстоўваецца на выраб сыру 30 працэнтаў малака (у многіх краінах, якія маюць добра развітую малакаперапрацоўку, — да 35—50 працэнтаў); доля Беларусі ў сусветным аб'ёме продажу сыра складае каля 6 працэнтаў, пры гэтым 100 тысяч тон прадаецца ў Расію. Ставіцца задача да канца 2015 года вырабляць у краіне сыру да 175 тысяч тон (цяпер вырабляецца 130 тысяч тон); адпаведна, вытворчасць малака павінна павялічыцца з цяперашніх 5,7 мільёна тон да 7,3 мільёна (з улікам малака ад насельніцтва — да 8,1 мільёна тон).**

* * *

**Дыетолагі лічаць сыр адным з найбольш карысных прадуктаў харчавання: каля 150 яго грамаў утрымліваюць сутачную норму кальцыю, патрэбную для арганізма чалавека, трэцюю частку нормы фосфару, прычым кальцый і фосфар знаходзяцца ў сыры ў найбольш аптымальных суадносінах. Спецыялістамі вызначана наступная норма: чалавек павінен спажываць за год 6,5 кілаграма сыру — у Беларусі спажываюць каля 2,5 кілаграма (а напрыклад, у Францыі — 25 кг, у суседніх Польшчы і Літве — 12,5 і 2 кг).**



**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Галоўны тэхнолаг завода Іна СЕМЯНЕНЯ (у цэнтры фотаздымка) і яе калегі: інжынеры-тэхнолагі Наталля БАРАНОЎСКАЯ і Вольга РЫТВІНСКАЯ, майстры цэхаў Ганна ЛЯШЧЫНСКАЯ, Лілія КАСПЯРОВІЧ, Тамара ГАЛАЙ, Раіса АЛІСТАРХАВА, Зоя ЯНОВІЧ, Аляксандр РАБЫЙ, начальнік лабараторыі Вольга ВІТКІНА.**

**2. У старым мадэрнізаваным цэху завода: падчас вытворчага працэсу.**

**3. Плаўленыя сыры – у шырокім асартыменце.**

**4. Перад падрыхтоўкай да працоўнай змены: праз імгненне сыраpоб Марыя МІКУЛІЧ замацуе на твары стэрыльную павязку і выйдзе з санпрапускніка ў цэх.**

**5. У памяшканні выспявання сыру.**

**6. Аператары Аляксандр ХАМІЦЭВІЧ і Яўген КОРБУТ на лініі згушчэння сыроваткі.**

**7. У старым мадэрнізаваным цэху: сыр «прымае» салёную «ванну».**

**8. Аператару Людміле АБАБУРЦЫ даручана кіраванне складанай аўтаматычнай лініяй.**

**9. На ўпакоўцы сыру, на здымку Ганна БАЙКО.**

**Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**



**Калектыў Любанскага сыраробнага завода віншуе ўсіх сваіх калег, спажыўцоў з надыходзячымі святамі — Калядамі і Новым годам і зычыць усім моцнага здароўя, дабрабыту, выдатнага настрою на ўвесь наступны год.**

**Ад імя калектыву Любанскага сыраробнага завода дырэктар Уладзімір ЛЕАНОВІЧ.**

# Хочаце пабачыць адзіны ў Беларусі дом-крэпасць?

## Тады вам — прамая дарога ў псіхіятрычную бальніцу!

**Не спяшайцеся крыўдаваць. Напраўду — у адзіным у Беларусі доме-крэпасці 1613 года цяпер размяшчаецца такая медыцынская ўстанова. І гэта — сапраўднае шчасце для гэтага помніка архітэктуры. У той час, калі дзясяткі іншых палацаў і сядзіб стаяць у руінах, крэпасць у Гайцюнішках падтрымліваецца ў цудоўным стане! А зусім нядаўна медыкі зрабілі тут рамонт, у значнай ступені вярнулі крэпасці былую веліч. Адкуль у Воранаўскім раёне, на самай мяжы з Літвой такі цуд? Збудаваў яго Пётр Нонхарт, галандскі дойлід, які напрыканцы XVI стагоддзя быў прызначаны галоўным архітэктарам Вільні — а ў Гайцюнішках вырашыў атабарыцца (хоць да Вільні 50 км.). Паколькі Нонхарт спецыялізаваўся на абарончых пабудовах, сваё жытло «па інерцыі» змураваў, як сапраўдную крэпасць. Ды так удала, што шведы не змаглі ўзяць яе падчас вайны!..**

...Яшчэ пару гадоў таму тут была строгая памежная зона, вас маглі запраста аштрафаваць за нелегальнае знаходжанне ў ёй. Цяпер Памежны камітэт, на шчасце, значна звузіў плошчу зоны. Пабачыць шматлікія помнікі архітэктуры стала прасцей! І, хоць дазвол па-ранейшаму трэба, цяпер усё лягчэй. Аплачваеце па месцы жыхарства невялікую мыту (каля 7 тысяч на год), запісваеце тэлефон патрэбнага памежнага атрада — і перад паездкай інфармуеце, што ў пэўны перыяд будзеце знаходзіцца тут. Па сутнасці, дазвольны прынцып замянілі на заяўленчы — што спрасціла жыццё многім вандроўнікам.

...Псіхіятрычная бальніца ў Гайцюнішках — аб'ект асаблівай аховы. Бо, апроч медыцынскай установы ў крэпасці на 50 ложкаў, ёсць яшчэ суседняе аддзяленне за калючым дротам, дзе ўтрымліваюцца злачынцы, якія прызнаныя псіхічна хворымі, — пад аховай міліцыі на прымусовым лекаванні.

Нягледзячы на гэта, на прахадной вас сустрэнуць вельмі ветліва і прыязна.

— Турысты? Праходзьце, турыстам мы заўжды рады — ёсць што паказаць, чым пахваліцца! Толькі я вас запішу ў сшытак, стараемся адсачыць геаграфію турыстаў!

Ахоўніца запісвае і тлумачыць, што фатаграфаваць можна ўсё, акрамя аддзялення з аховай. Усё ж такі спецаб'ект. Больш за тое, у сам дом-крэпасць можна ўвайсці, пахадзіць па першым паверсе, дзе знаходзяцца адміністрацыйныя пакоі. Тут жа можна пабачыць стэнд з гісторыяй крэпасці, багата аздоблены здымкамі. Бадай, гэта першая псіхіятрычная бальніца, дзе вам захочацца затрымацца!..

Прывітаць гасцей выходзіць **галоўны ўрач Маргарыта КУДЗЯН.**



— Вельмі радуюся заўжды, калі прыязджаюць госці, цікавяцца нашым домам-крэпасцю!.. Калі цікава, магу крыху распавесці яго гісторыю...

Сядаем у кабінеце галоўнага ўрача.

— Калі дачка Нонхарта выйшла замуж за пана Храптовіча, маёнтак пайшоў у пасаг, — пачынае аповед спадарыня Маргарыта. — Але яны тут не жылі, выехалі ў іншае месца. І пазней маёнтак адышоў лютэранскаму прыходу. Яны здавалі яго ў наём розным сем'ям, сярод якіх — Путкамеры (тыя самыя, звязаныя з Міцкевічам), Остэн-Сакены, Шрэтэры (Шротэры)... Калі мы займаліся аднаўленнем, знайшлі розныя звесткі наконт уладальнікаў дома. Дарэчы, падчас рамонту мы рабілі шурфы на сценах (гэта абавязковая працэдура). Толькі ўявіце — адмыслоўцы засведчылі, што канструкцыі страцілі сваю функцыю ўсяго на 30%, захаванасць цэглы — 70%! За 400 гадоў!!! Уявіце толькі — гэтыя 400 гадоў дом стаяў нават без водаадводаў! Можна смела сказаць, што многія пазнейшыя збудаванні, нават савецкага часу, прыйшлі ў аварыйны стан за шмат меншы прамежак часу...

Непадалёк знаходзіцца лютэранская капліца-пахавальня, збудаваная ў 1633 годзе, у якой спачыў некалі сам Пётр Нонхарт з жонкай. Ягоныя парэшткі і зараз тэарэтычна знаходзяцца недзе пад капліцай. Хоць жыхары Гайцюнішак згадваюць, што за савецкім часам у крыпту дужа любілі хадзіць «на экскурсію» каму не лянота. У выніку там мала што і засталося... Так выпала, што ўсе наступныя гаспадары маёнтка пасля Нонхарта былі менавіта лютэране, якія таксама спачывалі пасля ў капліцы. Капліца збудавана з цэглы і каменя толькі часткова, сярэдзіны сцен запоўнены глінаю. У выніку, калі пасля прыходу камуністаў людзям забаранілі маліцца і капліцу закінулі, у хуткім часе прадзіравіўся дах, і вада з ападкамі за лічаныя гады знішчылі практычна ўсю капліцу... Сёння там стаяць паўтары сцяны... Тым не менш, на руінах вісіць шыльда, што гэта — каштоўнасць, знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Але — на шыльдзе значыцца, што гэта... «Сядзіба Ваньковічаў XIX ст.» Відавочна, што проста пераблыталі, калі вешалі.

— За перыяд, калі змянялася шмат гаспадароў пасля Нонхарта, дом мала выкарыстоўваўся як жытло, — кажа Маргарыта Кудзян. — Часцей за ўсё тут былі гаспадарчыя памяшканні. На старых здымках і малюнках можам бачыць, што некаторыя вокны былі проста забітыя дошкамі... Аднак апошні ўладальнік, пан Рымша, паводле ўспамінаў, нават спрабаваў займацца нейкай рэстаўрацыяй. Прынамсі, крыты ганак, які мы бачым сёння, прыбудаваў менавіта ён сто гадоў таму. Таксама ёсць звесткі, што Рымша накрыў дом гонтай (праўда, здымкі гэтага не пацвярджаюць), размясціў у крэпасці выдатную бібліятэку, замовіў наборы мэблі з нейкай рэдкай хвоі...

Што за замак без містыкі і прывідаў? Спадарыня Маргарыта, як прадстаўнік дакладнай навукі, верыць у гэта з усмешкай. Але кажа, дзівосныя рэчы сапраўды бываюць.

— Калі мы рабілі рамонт, здымалі слой старой тынкоўкі. На адной з вежаў была жоўтая пляма. Думалі: бывае, 400 гадоў, можа, вільгаць якая ці што. Знялі тынкоўку — кладка выдатная, плесені няма. Патынкавалі нанова, зрабілі водаадвод — вільгаці быць не павінна. Праз нейкі час пляма праступіла зноў! У чым сакрэт? Магчыма, дом, як губка, усмактаў раней вільгаць — і цяпер аддае? А можа, што іншае?.. Дарэчы, ёсць звесткі, што некалі ў доме-крэпасці былі фрэскі, якія не захаваліся...

— Можа, проста кожны замак павінен мець свайго Бабая? — пытаюся ў спадарыні Маргарыты.



Так выглядала крэпасць першапачаткова. Рэстаўрацыя архітэктара Зміtра Савельева



Дом-крэпасць у Гайцюнішках — адзіны такі ў Беларусі!

— Я лічу, што ў нас Бабай — добразычлівы, з вельмі станоўчай энергіяй! Напэўна, добрыя людзі і добрыя будынкі жывуць доўга. Я ў гэтым замку праводжу вельмі шмат часу, бывае, што і суткамі — калі дзяжурства. І мне тут добра, адчуваю нейкую незвычайную лёгкасць...

Спадарыня Маргарыта любіць распавядаць, чаму шведы не змаглі ўзяць дом-крэпасць.

— Тут, вядома, вялікая заслуга Нонхарта: сцены паўтара метра таўшчынёю, на першым паверсе раней былі выключна байніцы замест вокнаў, там размяшчаўся гарнізон. Аднак ёсць і іншыя прычыны: замак знаходзіцца пасярод балот, якія 400 гадоў таму былі ўвогуле непраходнымі. Грунтовыя воды і сёння стаяць надзвычай высока. Шведы папросту не змаглі падкаціць да замка гарматы. А без гармат у іх нічога не атрымалася!

Пасля Другой сусветнай вайны ў замку была школа механізатараў, бальніца адчынілася тут у 1956 годзе. Ведаеце, падчас размовы з Маргарытай Кудзян мяне не пакідала думка: каб гэтая жанчына-ўрач ды так захаплялася гісторыяй, так любіла сваё, так разбіралася ў архітэктуры!..

— На пасадзе я працую ўжо 10 гадоў, а ўвогуле ў нашай лякарні — больш за дваццаць. Скончыла Гродзенскі медінстытут. Муж таксама лекар — яго размеркавалі сюды, я паехала следам. Вядома, спачатку была роспач — з цудоўнага Гродна ехаць працаваць на вёску!.. Не хапала тэмпу жыцця, стасункаў... А цяпер я задаволеная, што так атрымалася. Я знайшла сябе тут! А чаму я так захапляюся гісторыяй гэтага месца, гэтага будынка?.. Я лічу, што жыць на гэтай зямлі і не любіць, не ведаць, не шанаваць яе — немагчыма, недапушчальна! Тым больш, калі гаворка ідзе пра такі ўнікальны помнік архітэктуры!.. Праўда, калі я пачынала працу, пра гісторыю помніка тут ведалі мала што. Я зацікавілася, пачала шукаць звесткі. І зразумела, што гэта — сапраўдны дыямент беларускай архітэктуры!.. Таму і марыла прывесці замак у належны выгляд, надаць яму былую веліч. Паўнацэннай рэстаўрацыі не атрымалася, бо гэта вымагае значных сродкаў. Але, стараючыся не нашкодзіць, да аднаўлення помніка падышлі максімальна далікатна. Замянілі дах, паставілі на вежы вытанчаныя шпілі-крыжы, патынкавалі, вярнулі вокнам былую форму...

Для людзей, у якіх абвастрыліся псіхічныя захворванні, тэрмін утрымання ў замку — не больш за 40 дзён. А вось тыя, каго суд прызнаў злачынцам, могуць жыць тут гадамі. Не магу не спытацца ў Маргарыты Георгіеўны, ці часта пацыенты буяняць.

— Што вы, такое здараецца вельмі рэдка! Я вам патлумачу як урач, што такое можа здарыцца тады, калі чалавек адчувае няўпэўненасць і страх ад таго, што ён не ведае, што з ім будзе. У нас вельмі моцная сістэма псіхаадукацыі і інфармацыі, якую мы выпрацавалі на практыцы. Калі чалавек трапляе ў бальніцу, першае, што мы робім, — паказваем яму фільм, дзе падрабязна распавядаецца і дэманструецца, як ён будзе тут жыць, якія ён мае правы, што абавязаны выконваць, які будзе расклад дня, як будуць праходзіць спатканні са сваякамі, якія можа прымаць пасылкі, колькі ён тут будзе, як ён адсюль выйдзе. Мы таксама вельмі ўдзячныя Міндароўя, бо за апошнія гады зроблены вялікі крок наперад — цяпер з пацыентамі працуе не толькі псіхіятр, але і псіхолаг, і псіхатэрапеўт. Эфект палепшыўся ў разы!

Маргарыта Кудзян робіць што можа і нават больш. Мала таго, што аднаўляе замак, дык яшчэ ў мінулым годзе яе бальніца атрымала трэцяе месца па азеляненні сярод медыцынскіх устаноў Гродзеншчыны. Гэта цудоўна, калі ўрач, прафесіянал, так ставіцца да гісторыі, да нацыянальнай памяці. Маргарыта Георгіеўна марыць, каб памяць заснавальніка дома-крэпасці была ўшанавана належным чынам. Каб капліца, дзе спачывае Пётр Нонхарт, была адноўлена. Ці хоць бы «акультурана» — для гэтага неабходна спілаваць пароснія наўкол дрэвы, пачысціць тэрыторыю, усталяваць мемарыяльны валун. Адной спадарыні Маргарыце не справіцца. Яна спадзяецца на дапамогу і разуменне мясцовых улад.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.26 | 15.49 | 7.23 |
| Віцебск — | 8.23 | 15.31 | 7.08 |
| Магілёў — | 8.16 | 15.39 | 7.23 |
| Гомель — | 8.04 | 15.45 | 7.41 |
| Гродна — | 8.39 | 16.06 | 7.27 |
| Брэст — | 8.31 | 16.15 | 7.44 |

**Месяц**
*Поўня ў 10.14.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**
***Пр.*** *Анфісы, Кірылы, Патапа.*
***К.*** *Пятра, Тамаша, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты — 21 снежня



**1934 год** — нарадзіўся (вёска Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна) Іван Чыгрынаў, вядомы беларускі празаік, драматург, народны пісьменнік Беларусі. Аўтар раманаў «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужыя» і іншых твораў. Аўтар інсцэніроўкі «Плач перапёлкі», суаўтар сцэнарыя мастацкага фільма «Руіны страляюць...». Пераклаў на беларускую мову п'есы М. Горкага «На дне» і У. Вішнеўскага «Аптымістычная трагедыя». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1996 годзе.

**1913 год** — дзень нараджэння крыжаванкі. Мяркуецца, што стваральнікам першай крыжаванкі (cross-word puzzle) быў англійскі журналіст Артур Уін, які эмігрыраваў у Нью-Ёрк з Ліверпуля. Вынаходніцтва Уіна чамусьці не спадабалася суайчыннікам. Тады аўтар накіраваў свой пазл з 32 слоў у газету «Нью-Ёрк уорлд», дзе ён з'явіўся 21 снежня 1913 года.

## Цытата дня

*«Ці змог бы хлопчык, якім калісьці вы былі, ганарыцца такім мужчынам, як вы?».*

**Лорэнс Пітэр (1919—1990), амерыканскі педагог і літаратар.**

## КАБ ХЛОПЕЦ БЫЎ БАГАТЫМ, А ДЗЯЎЧЫНА — ПРЫГОЖАЙ

**Адразу пасля родаў нованароджанага абавязкова купалі, а парадзіху добра парылі. Амаль што паўсюдна вытрымлівалася традыцыя трайнога ачышчэння парадзіхі: каб яна тройчы (тры дні запар) папарылася ў лазні, прычым адным і тым жа венікам. Калі роды былі цяжкімі, парадзіха заставалася ў лазні ўсе тры дні: у яе была магчымасць добра выпарыцца, а затым управіць жывот і залатнік (пуп), каб не было грыжы і не балела сярэдзіна. Дзеля гэтага павітуха брала гліняны гаршчок і ставіла яго на пуп парадзісе. Яшчэ і сёння такім чынам народныя лекары правяць спіну («упраўляюць залатнік»).**

● У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі, вельмі небяспечнымі для нехрышчонага дзіцяці з'яўляюцца кантакты з чужымі людзьмі, якія могуць сурочыць немаўля. З гэтай нагоды павітуха брала з сабой у лазню невялічкі абраз (звычайна прысутнасць у лазні абразоў ці крыжоў катэгарычна забаранялася), якім хрысціла ўсе вуглы і печку, а ў час купання дзіцяці клала яго побач і паўтарала словы ахоўнай малітвы: «Анёлы з табой, ахоўнікі з табой». Каб дзіця не баялася сурокаў, бабка акурвала яго ладанам, апырсквала святой вадой.

● Так, пры першым купанні дзіця трымалі тварам на захад. У ваду клалі розныя святаянскія травы і прадметы: дзевяць вугольчыкаў, невялічкую манету, бурштын, некалькі крышталікаў солі. Калі купалі дзяўчынку, то ў ваду далівалі малако, каб была прыгожая, белая з твару; хлопчыку далівалі піва, каб ён быў дужым і адважным.

● Калі хацелі мець спакойнага, стрыманага, разважлівага памочніка, то першай налівалі ваду са студні. Засцерагаліся першым наліваць кіпень, каб сын не быў ганарыстым, паспешлівым, «гарачым».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства

| Сведения о виде и предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства | | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка/ кадастровый номер/ размер/ срок аренды/арендодатель | Целевое назначение земельного участка | | | | |
| Брестская область, Малоритский район, 0,3 км. северо-восточнее д. Луково на озере Луковское/ кадастровый номер 125200000001000445/ площадь 0,9600 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Малоритский райисполком, тел. 8(01651) 2 30 17 | Для строительства базы отдыха на 18 мест на озере Луковском | Территория участка на 0,29 га покрыта лесом, 0,40 га – пески, 0,27 га – древесно-кустарниковая растительность. Участок расположен в водоохранной зоне и прибрежной полосе оз. Луковского и имеет ограничения в использовании земель: в водоохранной зоне на площади 0,61 га, прибрежной полосе на площади 0,35 га, санитарно-защитной полосе водоотвода на площади 0,10 га соответственно. Подъезд к участку с автодороги Луково-Заболотье (участок находится в придорожной полосе автодороги Н-745 Луково (от а/д М-12)-Новое Заболотье (4 категория) | Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Малоритским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. Победителю аукциона строительство необходимо осуществлять на условиях: - строительство базы выполнить на расстоянии не менее 50,0 м от бровки земляного полотна автодороги до линии застройки; съезд к застройке выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 (02250) «Автомобильные дороги» раздел 6 с устройством покрытия согласно п.6.1.14.(как для главной дороги 4 тех. категории); при необходимости снабжения базы отдыха электричеством и связью строительство воздушной линии электроснабжения выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 «Автомобильные дороги» п.6.4., при переходе автодороги учесть дополнительную высоту насыпи 0,5 м и прокладку кабеля связи вдоль дорог производить за пределами полосы отвода на расстоянии не менее 14,0 м от оси а/д 4 категории; в населенных пунктах не менее 1.0 м от наружной бровки кювета, подошвы насыпи дороги или, в случае, когда отсутствует земляное полотно, тротуары – не менее 1,5 м от бортового камня улицы, дороги (укрепленные полосы обочины, кромки проезжай части) (согласно таб.9.1 СНБ 3.03.02-97 «Улицы и дороги городов, поселков и сельских населенных пунктов»), переходы через а/д выполнять закрытым способом с устройством защитного футляра на глубину не менее 1,4 м от верха покрытия проезжей части до верхней образующей футляра; проект в обязательном порядке согласовать с ДРСУ № 179; - места производства работ оградить дорожными знаками и схему их расстановки согласовать с ГАИ Малоритского РОВД; - за три дня до начала работ письменно известить ДРСУ № 179 (г. Малорита, ул. Советская, д. 134, тел./ф. 2 02 71, 2 36 02) о дате начала и окончания работ; после окончания работ в течение 1-го дня привести в порядок придорожную полосу и сдать по акту ДРСУ № 179 | 19 120 220 | 1 701 700 |

**Повторный аукцион состоится 31 декабря 2010 года** в **11.05** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

Для участия в повторном аукционе юридическое лицо, индивидуальный предприниматель в установленный в извещении о проведении срок подает заявление на участие в повторном аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам повторного аукциона.

К заявлению на участие в повторном аукционе прилагаются документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 27 декабря 2010 включительно;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; *представителем индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенная доверенность; *представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; *представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Порядок осмотра земельных участков осуществляется на местности по согласованию с арендодателем.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

**Участник, ставший победителем аукциона, обязан**: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона для размещения объекта строительства: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка для размещения объекта строительства и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

**Заявления на участие в повторном аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 21 декабря 2010 г. по 27 декабря 2010 г. включительно.**

## Усміхнемся!

**Запіска мужу: «Саша, забяры сына з дзіцячага садка. Ён сам цябе пазнае...».**

☺

Жонка — мужу:
— Хто абяцаў посуд памыць?
— Хто абяцаў, той і памые.
— Дык ідзі мый.
— Перад сном памыю.
— Тады ідзі спаць.

☺

**У выніку выбуху на лікёра-гарэлачным заводзе ўсё жывое ў радыусе трох кіламетраў патрабуе працягу банкета.**

☺

— ...А зараз клікаем іншым пальцам! Тры разы! Пачалі! Яшчэ два разы! Вы зможаце!

Аэробіка. 2050 год.

☺

**Нядзельнай раніцай два хмурныя мужыкі адбываюць пакаранне раннім выгулам сабак.**

**— Пятровіч, ты ж учора хваліўся, што навучыў свайго адчыняць дзверы прыбіральні і хадзіць на ўнітаз?**

**— Якое там! Мала таго, што гэты гад ходзіць міма ўнітаза, дык цяпер давялося замок павесіць на халадзільнік...**




Малюнак Марыны ГАРЭЛАВАЙ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 6209. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

